• первоначально археология представляла собой охоту за сокровищами;

• проведение раскопок от имени крупных немецких музеев;

• в течение XIX в. наряду с музеями развивались научные общества, посвященные исследованию Древнего Востока: Германский археологический институт (1829), Vorderasiatische Gesellschaft (1896), Немецкое восточное общество (1898);

• усовершенствование методов ведения археологических работ;

• полная публикация результатов;

• кропотливая забота при раскопках и регистрация каждого найденного артефакта;

• приписывание германским народам выдающегося культурного значения, которое служило национал-социализму свидетельством превосходства германских народов и арийской расы (идеи Густафа Коссинна) [6];

• с XX в. археология все чаще прибегает к методам из других наук [2].

Список использованной литературы

1. Manfred, K. H. Eggert: Archäologie. Grundzüge einer historischen Kulturwissenschaft / K. H. Manfred. – Tübingen : Deutschland, 2006. – S. 73.

2. Freeden, U. von. Spuren der Jahrtausende. Archäologie und Geschichte in Deutschland / U. von Freeden. – Stuttgart : Deutschland, 2003. – S. 26.

3. Баханьков, А. Е. Толковый словарь русского языка / А. Е. Баханьков, И. М. Гайдукевич, П. П. Шуба. – Минск : Белорус. ассоц. «Конкурс», 2006. – 398 с.

4. Беляев, Л. А. Палестинская археология в конце XIX – начале XX в.: православная, католическая и реформатская версии [Электронный ресурс] / Л. А. Беляев // Императорское Православное Палестинское общество. – Режим доступа: http://www.ippo.ru/historyippo/article/ palestinskaya-arheologiya-v-konce-xix---nachale-xx-201187. – Дата доступа: 25.10.2020.

5. Керрам, К. Боги, гробницы и ученые / К. Керрам. – М. : КЭМ, 1963. – С. 119–122.

6. Клейн, Л. С. Касинна и косиннизм. Этногенез и археология / Л. С. Клейн. – СПб. : Евразия, 2013. – Т. 1. – 38 с.

7. Кормышева, Э. Российская археологическая экспедиция в Гизе. Сезоны 1996–1998 гг. / Э. Кормышева, О. Томашевич, М. Чегодаев // Вестн. древ. истории. – 2000. – № 1. – С. 160–182.

8. Мегиддо (Тель-Мегиддо, Армагеддон, Megiddo) [Электронный ресурс] // Исторические и паломнические туры по Святой Земле (и не только). – Режим доступа: http://www.tsaritsyn-tours.com/?page_id=170. – Дата доступа: 29.10.2020.

9. От Института археологии до Немецкого археологического института [Электронный ресурс] // DAI. – Режим доступа: https://www.dainst.org/dai/geschichte. – Дата доступа: 26.10.2020.

10. Палестинское Общество. Страницы истории [Электронный ресурс] // Императорское Православное Палестинское общество. – Режим доступа: http://www.ippo.ru/historyippo/article/palestinskoe-obschestvo-stranicy-istorii-kn-yuzbas-200399. – Дата доступа: 24.10.2020.

11. Солкин, В. Человек, нашедший Нефертити, или Несколько слов о Людвиге Борхардте [Электронный ресурс] / В. Солкин // Livejournal. – Режим доступа: https://victorsolkin.livejournal.com/56147.html. – Дата доступа: 26.10.2020.

12. Томсинов, В. А. Краткая история египтологии / В. А. Томсинов. – М. : ЗЕРЦАЛО ВЕЧЕ, 2004. – С. 98.

13. Фингарет, С. И. Искусство Древнего Египта в собрании Эрмитажа / С. И. Фингарет. – Л. : Аврора, 1970. – С. 53.

14. Хаттуса // Большая советская энциклопедия : в 30 т. / гл. ред. А. М. Прохоров. – 3-е изд. – М., 1969. – Т. 1. – С. 172–178.

**К содержанию**

## ЭТНОГРАФИЯ, АНТРОПОЛОГИЯ

УДК 392.37

**А. А. ГУГНЮК**
Мінск, БДУ
Навуковы кіраўнік – Т. А. Навагродскі, д-р гіст. навук, прафесар

# АСАБЛІВАСЦІ ГЕНДАРНАЙ САЦЫЯЛІЗАЦЫІ ДЗЯЎЧАТ У ТРАДЫЦЫЙНАЙ ЗАХОДНЕПАЛЕСКАЙ ВЁСЦЫ

У артыкуле разглядаецца спецыфіка гендарнай сацыялізацыі дзяўчат традыцыйнай заходнепалескай вёскі. Аналізуецца роля сям'і і сельскай супольнасці ў фарміраванні дзявочай ідэнтычнасці.

Беларускаму грамадству з аграрным тыпам эканамічнага ўладкавання быў уласцівы так званы традыцыйны (патрыярхальны) тып узнаўлення насельніцтва. Сялянская сям'я з'яўлялася асноўнай вытворчай сацыяльнай ячэйкай, на якой замыкаўся працэс вырабу базавых, неабходных для жыццядзейнасці даброт. Дэмаграфічная структура сям'і грунтавалася на ўзростава-палавым падзеле працы: дарослыя мужчыны аралі, сеялі, збіралі ўраджай, разводзілі скаціну; жанчыны трымалі ў парадку дом, даглядалі хатніх жывёл, гатавалі ежу, пралі, ткалі, шылі адзенне, мылі, выхоўвалі дзяцей; дзеці дапамагалі па хаце, пасвілі хатнюю жывёлу і птушку [1, с. 100].

Працэсы сацыялізацыі і выхавання дзяўчат адбываліся ў межах рэлевантнай для традыцыйнага ладу нарматыўнай культуры. Існуючы гаспадарчы ўклад вызначаў неаднолькавае стаўленне да нараджэння дзяўчынкі і хлопчыка [4, с. 20]. Гэта абумоўлівалася ў першую чаргу сацыяльна-эканамічнымі фактарамі (сын спадкаваў зямлю, быў работнікам у хаце, які, ажаніўшыся, прыводзіў яшчэ работніцу і г. д.). Дачка залежала эканамічна ад бацькі і ў перспектыве ад мужа. Выдача яе замуж патрабавала ад сям'і значных сродкаў і выдаткаў для падрыхтоўкі пасагу і правядзення вяселля. Даволі часта дачку называлі “адрэзаным кавалкам”, “чужой крупеняй (работніцай)”, што было выклікана яе часовым знаходжаннем у бацькоўскай сям'і.

Выхаваўчы механізм суадносіўся з традыцыйным уяўленнем аб месцы і ролі прадстаўніц жаночага полу ў сям'і. Даследчыца І. Р. Чыкалава зазначыла, што гендарныя дачыненні ў традыцыйнай сялянскай сям'і можна ўмоўна ахарактарызаваць як заснаваныя на “кантракце жанчыны – хатняй гаспадыні і мужчыны-здабытчыка” [6, с. 52]. Народная культура была скіравана на фарміраванне ў свядомасці дзяўчыны з дзяцінства

“жаночай адаптацыйнай стратэгіі: арыентацыі на выкананне ролі жанчыны-маці” [8, с. 16]. Выхаваўчую функцыю ў дачыненні да дзяўчат рэалізоўвалі сям’я і сельская супольнасць. З ранніх гадоў дзяўчаткі апасродкавана прымяралі на сябе сацыяльныя ролі гаспадыні (праз прыцягненне да працы) і маці (прыглядаючы за малодшымі братамі, сёстрамі). Існаванне практыкі ранніх шлюбаў актуалізавала засваенне дзяўчынкай сваіх гендарных абавязкаў пачынаючы з дзяцінства.

Ад дзяўчат патрабавалі паводзін, абумоўленых шматлікімі забабонамі. На тэрыторыі Заходняга Палесся распаўсюджанне атрымалі наступныя: “Дзяўчыне забаранялася класці на галаву мужчынскую шапку, бо хлопцы будуць абыходзіць і замуж ніхто не возьме, акрамя хіба ўдаўца (в. Стайкі Баранавіцкага р-на), хадзіць абутай толькі ў адзін туфель (Бярозаўскі, Брэсцкі р-ны). Не дазвалялася падчас ежы глядзецца ў люстэрка, бо тады яна з’есць сваю прыгажосць (в. Пажэжын Маларыцкага р-на). Гаварылі, што дзяўчына, якая кідае смецце за парог ці сядзіць на парозе, зусім не знойдзе сабе мужа, а ў той, што пакідае пражу на калаўроце, вырасце барада (што зробіць яе непрыгожай і, адпаведна, праблематызуе выхад замуж)” (в. Малеч Бярозаўскага р-на) [5, с. 358].

Турбуючыся пра лёс сваёй дачкі, маці забараняла ёй садзіцца на пень: “Мы дзеўкам забаранялі на пянёчкі садзіцца, бо без хлопцаў застануцца. Пянёчак – увасабленне чагосьці сухога, трухлявага і старога (пазбаўленага вітальнай патэнцыі і жыццёвых сіл). Таму дзяўчаты не садзіліся на пні, каб пазбегнуць бясплоднасці, «сядзення ў дзеўках»” [2, с. 30]. Лічылі, што “няможна дівчынам пырыступаты пынёк, дэрево, бо дітэ будуць ны жывучыя (в. Прыбарава Брэсцкага р-на). Дзяўчыне забаранялася сядзець на стале (ці яго куце), бо нібыта яе чакае няўдача пры замужжы. Дзяўчыне з мокрым падолам пагражалі, што яна выйдзе замуж за п’яніцу. Тое ж яе чакае, калі фартух на жываце часта мокне” [7, с. 11]. Бытаванне такіх з’яў народнай культуры падкрэслівае наяўнасць страху і боязі не выйсці замуж і “застацца ў дзеўках” як у саміх дзяўчат, так і ў іх бацькоў, у сельскага грамадства.

Калі дзяўчаты парушалі нормы, прынятыя ў грамадстве, яны аўтаматычна траплялі пад калектыўнае асуджэнне, сацыяльныя санкцыі. Так, да прыкладу, у дачыненні да распусных дзяўчат уладкоўваліся так званыя насмешкі (надпісы на платах, абзыванні, непрызнанне ў моладзевым калектыве). У паўсядзённым жыцці вёскі шырокае распаўсюджванне атрымалі дыялектныя пазыўныя, якімі карысталіся ў дачыненні да моладзі, у прыватнасці дзяўчат. Народная гаворка жыхароў Заходняга Палесся каларытна перадае эмацыйны і ацэначны складнік. Так, дзяўчат нядобрага нораву называлі ў народзе “распутамі”, “совушчымі”, “кропэвніцамі”.

Такім чынам, у вясковай супольнасці існаваў спецыфічны стандартызаваны механізм сацыяльнага канструявання гендара. Яго можна ахарактарызаваць як рэпрэсіўны, паколькі існавалі кантроль за паводзінамі дзяўчат, асуджэнне дашлюбных палавых сувязей, публічнай праявы сімпатый паміж моладдзю, патрабаванне захаваць цноту, шматлікія найменні, насмешкі, нязменнасць і прыхільнасць традыцыйнай сямейна-шлюбнай мадэлі са старшынствам мужа і падпарадкаваным становішчам жонкі. Выкананне патрабаванняў звонку, рэалізацыя знешніх чаканняў садзейнічалі фарміраванню ідэнтычнасці дзяўчыны.

Лічыць, што тагачасныя дзяўчаты, жанчыны ўспрымалі сваё становішча як выключна прыгнечанае, памылкова. Не трэба забываць пра аўтарытэтнасць царквы ў сялянскім асяроддзі. Хрысціянская светапоглядная мадэль фарміравала пэўны культурна-каштоўнасны фон у свядомасці сялянак: уяўленне аб сваёй гендарнай ролі, асуджэнне бясшлюбнасці, абортаў, безумоўнасць нараджэння дзяцей “колькі Бог дасць”.

Такім чынам, сацыяльны парадак у традыцыйнай заходнепалескай вёсцы рэгуляваўся царквой і сельскай супольнасцю (праз звычаёвае права, публічнае выказванне ганьбы ці пашаны). Дзявоцтва абцяжарвалася шэрагам сацыяльных чаканняў, асноўным зместам якіх была “своечасовасць” рэалізацыі дзяўчынай матрыманіяльнага і рэпрадуктыўнага “прызначэння” [3]. Замужжа і нараджэнне дзіцяці лічыліся асноўнымі вопытамі, якія павінна была прайсці дзяўчына.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Авдеев, А. А. Исторические типы народонаселения в докапиталистических формациях / А. А. Авдеев. – М. : МАКС Пресс, 2003. – 160 с.

2. Астрамечаўскі рукапіс / Брэсц. раён. выкан. кам. – Брэст : Альтэрнатыва, 2016. – № 2. – 96 с.

3. Белова, А. В. Девичество российской дворянки XVIII – середины XIX в.: телесность, сексуальность, гендерная идентичность [Электронный ресурс] / А. В. Белова. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/devichestvo-rossiyskoy-dvoryanki-xviii-serediny-xix-veka-telesnost-seksualnost-gendernaya-identichnost/viewer. – Дата доступа: 19.02.2021.

4. Жанчына ў беларускай народнай творчасці / Акад. навук БССР, Ін-т гісторыі. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1940. – 519 с.

5. Нарысы гісторыі культуры Беларусі. У 4 т. Т. 3. Кн. 2. Духоўная культура / А. І. Лакотка. – Мінск : Беларус. навука, 2016. – 751 с.

6. Чикалова, И. Р. Гендерная система (пост)советской Беларуси: воспроизводство и трансформация социальных ролей в публичной и приватной сфере / И. Р. Чикалова // Российские и славянские исследования : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2009. – Вып. 4. – С. 51–66.

7. Швед, І. А. Перадшлюбны перыяд. Вяселле на Берасцейшчыне / І. А. Швед // Астрамечаўскі рукапіс / Брэсц. раён. выкан. кам. – Брэст : Альтэрнатыва, 2015. – № 1. – С. 8–12.

8. Якубінская, А. Д. Традыцыйныя спосабы і сродкі сацыялізацыі дзяцей у беларускіх сялян у другой палове XIX – першай палове XX ст. : аўтарэф. ... дыс. канд. гіст. навук : 07.00.07 / А. Д. Якубінская ; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2009. – 22 с.

**К содержанию**

УДК [394:908](476.7)

**Д. В. ЖУКАЎ**
Полацк, ПДУ
Навуковы кіраўнік – У. А. Лобач, д-р гіст. навук, дацэнт

## ВОБРАЗ ПАДАРОЖНАГА БОГА Ў ЭТЫЯЛАГІЧНЫХ ЛЕГЕНДАХ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ

У артыкуле разглядаюцца сюжэты легенд этыялагічнага зместу. Асноўная ўвага ў працы акцэнтуецца на легенды пра стварэнне пэўных прадстаўнікоў жывёльнага свету (бусел, зязюля, мядзведзь), зафіксаваныя на тэрыторыі Падзвіння. У артыкуле прасочваецца роля падарожнага Бога (Бога-Дэміурга) і раскрываюцца прычыны, па якіх ім была створана тая ці іншая жывёла.

Беларускі народны эпас мае даволі значную групу легенд этыялагічнага характару. Яны своеасабліва расказваюць пра паходжанне розных аб’ектаў і з’яў. Як вынікае з іх аналізу, у асноўным гэтая катэгорыя легенд пераплятае міфалогію і казачныя элементы з хрысціянскім веравучэннем. Тэма даследавання актуальна, паколькі этыялагічныя легенды з’яўляюцца не толькі часткай беларускага фальклору, але і важнейшым кампанентам карціны свету і адлюстроўваюць народныя ўяўленні пра этыку і мараль.

У шэрагу выпадкаў у легендах праяўляецца ўласцівы даўнім народным вераванням дуалізм. У той час як стваральнікам усяго прыгоднага на зямлі прызнаваўся Бог, тварцом усяго шкоднага і варожага чалавеку з’явіўся чорт. Вобраз падарожнага Бога з’яўляецца найбольш вядомым і распаўсюджаным у народнай культуры беларусаў. У ходзе фальклорна-этнаграфічных экспедыцый Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, праведзеных на тэрыторыі Падзвіння ў 1990–2000-я гг., быў зафіксаваны значны аб’ём матэрыялаў, якія датычацца этыялагічных

легенд. Сярод іх вылучаецца група легенд, якая апавядае пра з’яўленне розных жывёл і раслін.

Згодна з легендамі, стварэнне ўсяго жывога і нежывога на зямлі прыпісваецца Богу, хоць вобраз яго набываў усё болей “зямны” характар. Так, напрыклад, з меху, які Бог загадаў аднаму чалавеку кінуць у балота (мора) і не заглядаць у яго, па зямлі распаўзліся гады і разляцеліся мухі. Парушыўшы Богаву забарону, чалавек пацікавіўся, што ў тым мяху, і развязаў яго. За гэта Бог пакараў чалавека, ператварыўшы яго ў бусла, і загадаў яму вечна збіраць гадаў, якія распаўзліся па зямлі: *“Бог сабраў такіх насякомых, і мух, і клапоў, там усякіх казюрак і ў мяшок завязаў. Нясі, – гаворыць, – на тое места, дзе яму сказалі. А ён што – нёс, нёс. А тады захацеў, каб паглядзець, каго ж ён нясець. Мяшок атвязаў, а мýшына – пырх. Вот ён кінуў мяшок, ні завязаў, за мушынай пабег. Каб улавіць. А к гэтаму ўрэмю ўсе распаўзліся. Вот ні было б у нас ні вужак, ні жаб, нічога. А так сталі і клапы, і ўсякія мухі, і казюркі. Бог яго заставіў... Буцяном здзелаў і сказаў: сабірай”* (Ушацкі р-н) [3, с. 28]. На Падзвінне некаторыя дэталі гэтай легенды адрозніваюцца. Так, на Лепельшчыне хлопец мае імя Сцяпан, на Глыбоччыне яго называюць Габрусём.

Але найбольш вялікае адрозненне гэтага сюжэта было зафіксавана ў Докшыцкім раёне. У галоўнай ролі фігуруе знахар, які сам сабраў змей і іншых “гадаў” у мяшок, але таксама не змог яго данесці: *“А адзін знахар знаў, што ж гэта нада ўсіх ужо сабраць, ён сабраў у мяшок і нёс, вот яны сталі тачыцца, сталі яго кусаць, сталі яго грысці, гэтыя ўсе змеі і лягушкі і ўсе, і ён не ўцярпеў... А Бог сказаў: «Раз ты знахар, сабяры, ты ўмееш іх сабіраць». Ён мяшок паставіў, яны ўсе спаўзаліся, усе к яму ішлі, ішлі. І вот ён нёс-нёс гэты мяшок, не мог ён выцерпіць, і ён упусціў гэты мяшок, і пайшлі яны поўзаць, гэтыя змеі і лягушкі, і ўсе. І Бог так зробіў, што сабірай жа ты сам цяпер, і зробіў знахара буслам, і штоб ён іх сабіраў”* (Докшыцкі р-н) [3, с. 30]. Легенда пра паходжанне бусла з’яўляецца самай знакамітай на тэрыторыі Падзвіння і сустракаецца ў Чашніцкім, Лепельскім, Докшыцкім, Бешанковіцкім, Глыбоцкім і Шаркаўшчынскім раёнах.

Другі папулярны сюжэт, які згадваецца як у гістарычных і фальклорных зборніках, так і ў ходзе сучасных экспедыцый, звязаны з паходжаннем зязюлі: *“Гэта мама расказывала, што зязюля была бабай, і што-та яны там з мужыком пасварыліся, а даўней паветкі былі і зярно там, і семя насыпана, цэлы засек быў, івот яна яго паслала там. Кажыць, там за ільносемям – крупы, схадзі круп дастань. А гэта ж ільносемя, як вада, ты ж на яго стань – яно ж і тонець. Ну вот, яна яго ждала-ждала, а ён не прыйшоў. Яна яго звала: «Якуб! Дай круп! Якуб! Дай круп!» І вот яна гэдак зробіла, і яе Бог перавярнуў у зязюлю”* [2, с. 96]. На Віцебшчыне часцей за ўсё сустракаюцца два розныя напаўненні дадзенага сюжэта.

У першым галоўнымі героямі з’яўляюцца жонка з мужам, а ў другім – маці і дачка: *“Матка забіла дачку. Дачка тая пацярала ключы, а гэта матка забіла дачку. А тады, калі яна забіла, пачала плакаць: «Аксюш, праснісь, Аксюш, праснісь, ключы нашлісь». І вот яна всё кукуець і кукуець, а ключы нашлісь. І Бог яе так аброк – гэтай кукушкай быць”* (Віцебскі р-н) [3, с. 27].

Прыклад з’яўлення мядзведзя таксама звязаны з пакараннем чалавека, які правініўся перад Богам: *“Здаўна бог хадзіў па зямлі, цяпер ужо не ходзіць. Ну, і захацелася мужыку з жонкай спужаць бога. Яны прыбяднелі, бедна жылі. – А што ён ходзіць, нас нічым не надзяляець, – спужаем жа і мы яго. І сталі думаць, як яго спужаць. Падлезем пад мост і замычам, а бог успудзіцца нас. А бог сказаў: – Калі ж вы так замычалі, то і будзеце век мычаць. І абярнуў іх мядзведзямі. З таго і мядзведзі сталі”* [1, с. 54]. Варта звярнуць увагу на тое, што ў іншых сюжэтах з’яўлення мядзведзя задзейнічаны людзі, якія маюць розны сацыяльны статус.

Такім чынам, легенды пра паходжанне бусла, зязюлі і мядзведзя з’яўляюцца найбольш удалымі прыкладамі, калі прычынай для стварэння чагосьці новага з’яўляецца сімбіёз жадання чалавека рабіць па-свойму і волі Бога. У той жа час легенды пра паходжанне жывёл і раслін нельга назваць вынікам наіўнага светапогляду вясковага жыхара Падзвіння. Легенды падобнага роду сведчаць аб стаўленні беларускага селяніна да касмагоніі і аб выспяванні стыхійна-матэрыялістычных уяўленняў аб прыродзе і грамадстве.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Легенды і паданні / склад. М. Я. Грынблат і А. І. Гурскі ; рэд. тома А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 544 с.

2. Лобач, У. А. Міф. Прастора. Чалавек: традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве / У. Лобач. – Мінск : Тэхналогія, 2013. – 511 с.

3. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 2. Народная проза беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 1 / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача. — Навапoлацк : ПДУ, 2011. – 292 с.

**К содержанию**

УДК 394.268(476)

**Т. А. ІГНАЦЮК**
Брэст, БрДУ імя А. С. Пушкіна
Навуковы кіраўнік – В. Ю. Піліповіч, ст. выкладчык

# ЛЕТНІ ЦЫКЛ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КАЛЯНДАРНАЙ АБРАДНАСЦІ СЯЛА НА КОБРЫНШЧЫНЕ Ў 30–50-Я ГГ. XX СТ.

У артыкуле прыводзяцца вынікі вывучэння і палявых даследаванняў летняга цыкла традыцыйнай абраднасці на прыкладзе вёсак Кобрынскага раёна. Апісаны звычаі і абрады, прыкметы і прымаўкі, звязаныя з Тройцай, паслятраецкімі прысвяткамі, Купаллем, Пятроўкай, святамі ў гонар святых Пятра і Паўла, Ануфрыя, Іллі, Барыса і Глеба, існаваўшыя на перыяд 30–50-х гг. XX ст. у вёсках Балоты, Кісялёўцы, Рыбна, Магдалін, Барысава, Лелікава, Дывін, Літвінкі, Стрыгава, Астромічы, Запруды.

Кожны з цыклаў каляндарнай абраднасці ўключае ў сябе шэраг святаў і прысвяткаў з прымеркаванымі да іх традыцыямі, якія вызначаюць асаблівасці цыкла. Асобныя перыяды і дні ў календары дапамагалі размежаваць поры года. Так, напрыклад, Піліпаўка лічылася пачаткам зімняга цыкла, які завяршаўся провадамі зімы і гуканнем вясны (прыходзіліся прыкладна на Грамніцы ці Масленіцу). Адпаведна, гэты час лічыўся пачаткам вясновага цыкла, які распачынаўся Вялікім постам. Прамежкавым перыядам вясны і лета можна лічыць Тройцу, якая магла выпадаць на час з 23 мая па 26 чэрвеня. Завяршальнай фазай летняга цыкла і, адпаведна, пачаткам восеньскага з’яўляецца Успенскі пост, які супадае з асноўнымі абрадавымі дзеяннямі па збору ўраджаю. Да пераходнага этапу двух апошніх цыклаў можна аднесці жніво (ад Зажынак да Дажынак). Зыходзячы з такой перыядызацыі, да святаў летняга перыяду адносяцца Тройца, Градавая серада, Зелянец, Дзесятуха, святы ў гонар святых Ануфрыя, Іаана (Яна) Хрысціцеля (Купалле), Пятра і Паўла, Ільі, Барыса і Глеба.

Для сялян адным з самых галоўных святаў на працягу года нароўні з Раством Хрыста і Вялікаднем з’ўлялася Тройца. Звалі яе яшчэ інакш – Сёмуха – сёмы тыдзень пасля Вялікадня. Але ў разглядаемай мясцовасці такая назва выкарыстоўвалася радзей [7]. Вялікае свята патрабавала адпаведнай падрыхтоўкі: прыбіраліся памяшканні, упрыгожвалася хата, панадворак. Святкавалася Тройца звычайна тры дні: нядзеля, панядзелак і аўторак. Ва ўсе гэтыя дні ў царкве праводзіліся святочныя набажэнствы. На другі дзень свята (панядзелак) маглі абыходзіць хрэсным ходам вёску. Большасць сем’яў прытрымлівалася забароны на працу, асабліва тую, што тычылася палявых работ.

Вялікае значэнне надавалася выгляду жылля селяніна, якое абавязкова ўпрыгожвалі зелянінай: на падлозе і на сцежцы ў двары высцілаўся *“пахучы плышнык”* (аер), галінкі дрэў (бяроза, дуб, рабіна, клён, акацыя, асіна і інш.) затыкалі ў розных кутках хаты, на покуці, каля абразоў, фотарамак, уздоўж ці па-над дзвярыма, вокнамі. Некаторыя маглі развешваць зеляніну дрэў звонку хаты [1; 2; 6]. Некаторыя гаспадары зразалі маладыя бярозкі і ўкопвалі ці ставілі іх каля ганка [13, с. 468]. Адпаведным чынам упрыгожвалася да свята царква: раскідваўся “плышнык”, ставілася бярозка [3]. Сярод жыхароў існаваў выраз *“зробыты Трійці”*, што азначала *‘ўпрыгожыць хату, панадворак зелянінай да свята ў гонар Святой Тройцы’* [10].

Зеляніну, якой упрыгожвалі хату, звычайна здымалі праз тры дні і спальвалі. Галінкі бярозы і аер з царквы прыхаджане забіралі з сабой у нядзелю пасля Тройцы па аналогіі з яловымі лапкамі на Вадохрышча. Іх таксама захоўвалі ў хаце: “плышнык” пакідалі ў шафах, каб моль не шкодзіла адзенне [6], адносілі зеляніну на гарышча, затыкалі яе па кутках хаты, каб засцерагчы ад паразітаў, маглі аднесці на поле, каб ніштo не пашкодзіла пасевам [8]. У в. Запруды засохлым лісцем набівалі падушкі. Лічылася, што гэта засцеражэ ад галаўнога болю. Другія выкарыстоўвалі іх для накурвання ад розных захворванняў [13, с. 468].

У в. Лелікава існаваў звычай “вадзіць крынку”, які рэдка сустракаецца ў іншых вёсках Кобрынскага раёна. Ажыццяўляўся звычай падлеткамі, якія прыгожа апраналі маладую дзяўчыну, ішлі разам з ёй па вёсцы, а пасля вялі яе ў поле пад песню *“Ведемо крынку на пацёрінку…”*. Каля вялікага дрэва спявалі і танцавалі да вечара [13, с. 470].

Як і на іншыя вялікія святы, на Тройцу выпякалі пірагі, забівалі парася, рабілі гулянні з музыкай і танцамі [13, с. 469]. Тройцу сапраўды можна лічыць часам вяселляў, што неаднаразова адзначалася самімі рэспандэнтамі [12, с. 137].

Серада пасля Тройцы звалася Градавой ці Сухой, як і пасля Вялікадня. У гэты дзень забаранялася працаваць у полі. Парушэнне дадзенага павер’я магло прывесці да пашкоджання градам ці засухай пасеваў [6].

У чацвер праз тыдзень пасля Тройцы адзначалася свята Зелянец (Зылынэць). Яго адлічвалі як чацвер дзявятага тыдня пасля Вялікадня. Таму ў іншых рэгіёнах Беларусі яго называлі Дыветухай (Дзявятнікам і да т. п.). Аднак апытаныя рэспандэнты ўзгадвалі толькі першы варыянт назвы свята. Яго этымалогія была звязана з асвячэннем у гэты дзень “зілля” (зёлак), якое спляталася ў вяночкі. Яны захоўваліся ў хаце каля асвячоных рэчаў ці ў цёмных месцах (звычайна ў каморы) [1]. У будучым іх выкарыстоўвалі як лекавыя сродкі: рабілі з іх адвары, “накурваліся”

(накіроўвалі на хворага дым ад тлеючых на вельмі слабым агні раслінаў) [11, с. 264]: *“Мынэ роздуло морду. Я прыйіхала додому, а тая баба була і кажэ, шо накурыся свячоным зіллем. То бралы ўсе свячонэ зіллечко і накуровалы. Я покурылась і мыні пройшло…”*. Адна з рэспандэнтак казала, што калі не дапамагала ўласнае “зілле”, то хадзілі па дзевяці хатах і прасілі частку асвечаных траў. Пасля гэтага зноў спрабавалі накурыцца сабранымі травамі [10]. Асвечаныя “на Зелянца” зёлкі выкарыстоўваліся падчас пахавальнай абраднасці: клаліся ў труну памерламу чалавеку [13, с. 471].

25 чэрвеня адзначалася свята ў гонар святога Ануфрыя (Оныпрій). Яно служыла адлікам для пачатку сенажаці [7]. Да гэтага дня неабходна было пабудаваць будкі ў лесе, у якіх жылі падчас нарыхтоўкі сена ў выпадку далёкага знаходжання ад хаты. *“Колысь казалы, шо на того Оныпрія ходылы в Островы будкы робыты. Коб там ночоваты і сіно робыты. Вжэ косылы, люды ночовалы. Возьмуть хліба, воды зачэрпнуть, всё накрышать. Так йілы і так жылы”* [8]. У сам жа дзень рэкамендавалася не працаваць, у адваротным жа выпадку можна было наклікаць бяду. Рэспандэнты адзначалі дадзенае павер’е, калі сустракаліся з падобнымі выпадкамі самі: парушэнне – нейкая бяда ў жыцці ці ў вядзенні гаспадаркі [10].

Дзясятая пятніца пасля Вялікадня звалася Дысетухай [7; 3]. У гэты дзень забаранялася працаваць. Лічылася, што парушэнне павер’я можа прывесці да спынення росту пасеваў [10]. Аднак у разглядаемы перыяд часткай жыхароў асаблівай пашаны святу ўжо не надавалася [6].

Цэнтральным святам у летнім цыкле каляндарнай абраднасці з’яўлялася Купалле. Час з 6 на 7 ліпеня быў насычаны рознымі прымхамі, забабонамі, звычаямі і абрадамі. Варыяцый назвы свята ў мясцовасці было некалькі: Іван, Купало, Купалле, Іван Купало і інш.

Шырокараспаўсюджаным звычаем на гэтае свята быў збор зёлак, якія зваліся Іванавымі. Лічылася, што сабраныя менавіта ў гэты час расліны валодаюць асаблівымі лекавальнымі здольнасцямі, з’яўляюцца больш жыватворнымі. Некаторыя асвячалі іх падчас святочнага набажэнства ў царкве. Адзначалася, што гэтыя зёлкі, у адрозненне ад асвечаных на Зелянца, збіраліся пераважна ў букеты. Прызначэнне і выкарыстанне Іванавых траў было аналагічным з сабранымі на Зелянец.

Бытавала меркаванне, што ў гэты дзень асабліва небяспечнымі з’яўляюцца нячыстыя сілы, якія могуць прынесці шкоду гаспадарцы. Часцей гэта тычылася хатніх жывёл. Лічылася, што ведзьмары праводзілі рытуалы, ператвараліся ў жывёл (катоў, змей, свіней і інш.), пасля чаго “адбіралі малако” ў кароў [7; 13, с. 473]. Зрабіць гэта ведзьмары маглі шляхам збірання расы раніцай на Івана. Для гэтага яны збівалі яе пры

дапамозе рэшата, такім чынам адбывалася сімвалічнае збіванне малака [12, с. 169].

Каб нячысцікі не нанеслі шкоды, выконваліся пэўныя рытуальныя дзеянні: напярэдадні свята, у ноч на Івана (7 ліпеня), пабудовы абсыпалі асвечанымі соллю ці макам. Лічылася, што дзеянні ведзьмароў не будуць мець моцы, пакуль яны не збяруць усе рассыпаныя макулінкі [5]. Другія абкурвалі "свянцонымі зёлкамі" членаў сям'і, пабудовы, жывёл [12, с. 169].

У в. Стрыгава купальскую расу надзялялі карыснымі лекавальнымі якасцямі: каб пазбегнуць розных хвароб, раніцай да ўзыходу сонца ўмываліся гэтай расой [13, с. 473].

Асаблівае значэнне свята займала ў жыцці дзяцей і моладзі. Ноччу яны хадзілі шукаць папараць-кветку, якая магла прынесці чалавеку шчасце і здароўе. Некаторыя нават лічылі, што чалавек, якому атрымаецца яе знайсці, зможа валодаць усімі ведамі і знахарскімі здольнасцямі [2; 10; 11, с. 263; 13, с. 476].

Сярод дзяўчат сустракаўся звычай пляцення вянкоў і спускання іх па вадзе, аднак сэнс гэтых дзеянняў выканаўцамі ўжо амаль не разумеўся [10]. У в. Літвінкі было зафіксавана выкананне варожб на Івана, дзеянні якіх былі скіраваны на выклік сну, у якім жадалі пабачыць суджанага. Адны для гэтага збіралі 12 розных траў, якія клалі пад падушку, на якой спалі. Другія дзяўчаты ў адной сарочцы тройчы аббягалі студню, сімвалічна ўзмахваючы рукамі, і, ні з кім не гаворачы, клаліся спаць. Трэція клалі пад падушку пясок са скрыжавання дарог [13, с. 475].

У ноч на Купалу моладзь магла збірацца разам, дзе паліла вогнішчы, спявала, скакала цераз агонь [12, с. 170; 13, с. 474]. Звычай гэты сустракаўся не паўсюдна.

Зранку сяляне назіралі за сонцам: лічылася, што яно неяк асабліва "іграе" ў гэты дзень, пераліваючыся рознымі колерамі, ствараючы кругі вакол сябе [2]. Таму існавала такая прыказка: *"На Івана сонца грало. Грало-грало – пырыстало"*. *"Малэю я помню скотыну пасла і всё казалы: «На Івана рано сонцэ грало, сонцэ грало – пырыстало». А Іван жэ ж жывэ 7 іюля. І помню, тыпэр то гэтого ныма, а раній то такыі чырвоны вокруг сонца кружкы"*.

Значная колькасць рэспандэнтаў адзначала, што такія звычаі, як пошук папараць-кветкі, паленне вогнішчаў ды варожбы, ніколі не былі вядомы. Таму традыцыі Купалля ў іх абмяжоўваліся збіраннем зёлак і назіраннем за ігрой сонца.

Праз тыдзень пасля Тройцы пачынаўся Пятроўскі пост. Сялянамі ўжываліся толькі скаромныя стравы [1]. Існавала прыказка: *"На Пытра вдовці жэняцця"*. Звязвалі гэта з тым, што неабходны былі работнікі на далейшы час прыборкі ўраджаю [7].

Само свята ў гонар святых Пятра і Паўла прыходзілася на 12 ліпеня. Рэспандэнтамі адзначалася, што ў гэты дзень забароны на працу маглі парушацца, але гэта не асуджалася, паколькі гэта быў прыгодны час для збірання сена, асабліва калі было спрыяльнае надвор'е.

Адначасова свята было прыкладным адлікам для пачатку жніва [2]. Усё залежала ад надвор'я і, адпаведна, ад гатоўнасці збожжавых культур. Да гэтага часу запасы мукі маглі скончыцца, таму гаспадыні, нават калі зерне яшчэ не зусім паспела, маглі нажаць яго, насушыць, зжаць мукі і спячы першы хлеб. Тое ж самае тычылася і бульбы: пачыналі збіраць новы ўраджай для ўжывання ў ежу. Зыходзячы з гэтага бытавала такая прыказка: *"До Івана і мукыці ны мала, а на Пытра – наварыла і напыкла"* [7; 8].

Свята ў гонар Ільі адзначалася 2 жніўня. З гэтым днём звязана значная колькасць парэмій. Заўважалі, што на гэты час звычайна прыходзяцца моцныя дажджы, якія маглі пашкодзіць пасевам, таму казалі: *"Ілля наробыть гнылля"*. У першую чаргу хваляваліся за ўраджай бульбы, які ад празмернасці дажджу мог сапсавацца [10]. Заўважалі, што дні станавіліся карацейшымі, таму казалі*: "На Ільє высплюся й йе"* [9]. Існавала яшчэ адна прыказка, звязаная з набліжэннем восені: *"Прыйшов Пытрок – упав лысток, прыйшла Ілля – упало два"* [10].

Бытавала прыкмета, што купацца ў вадзе можна толькі да Ільі, бо пасля яго нячысцікі зацягваюць у ваду. Другі час, прыгодны для купання, атаясамлівалі з перыядам цвіцення лёну [6]. Іншыя лічылі, што вада пасля Ільі халодная, паколькі ночы становяцца даўжэйшымі, таму час гэты быў непрыгодным для купання [4]. У сялянскім асяроддзі існавала меркаванне, што самым прыгодным часам для гэтага з'яўляецца перыяд ад Пятра да Ільі [5].

Радзей у сялянскім асяроддзі згадваецца свята ў гонар святых Барыса і Глеба (6 жніўня). Некаторыя рэспандэнты яшчэ ўзгадвалі прыказку, звязаную з ураджаем: *"На Івана мукыці ны мала, на Пытра – наварыла і напэкла, а на Борыса хоть йіш і роспорожысся (роспоясысся)"*; *"Роспоясысся – йісты можно так, шо і пояс порвэцця"*. [10].

Неабходным бачыцца адзначыць, што ў разглядаемы перыяд летнім святам надавалася большая пашана і ўвага, у параўнанні з наступным часам, паколькі яны былі цесна звязаны з вядзеннем гаспадаркі, якая займала галоўнае месца ў жыцці селяніна. Большасць свят служыла адлікам для пачатку і сканчэння розных сельскагаспадарчых работ, што замацавалася ў парэміях. Адметны той факт, што частка звычаяў была звязана з выкарыстаннем раслін, зеляніны, якія набывалі лекавальную моц, выконвалі сакральную, а таксама функцыю абярэга ад нячысцікаў і прыродных катаклізмаў праз выкананне пэўных дзеянняў у вызначаныя дні календара.

Праводзячы аналіз стану захаванасці свят летняга цыкла і іх традыцый у 30–50-я гг. XX ст., можна зрабіць наступную выснову: выкананне звычаяў і абрадаў часта залежала ад згуртаванасці саміх жыхароў вёскі ці яе часткі (групы хутароў), што добра прасочваецца на прыкладзе святкавання Купалля. Так, напрыклад, у вёсках Балоты, Дывін, Лелікава больш яскрава адбывалася яго святкаванне, што адзначаецца як жыхарамі гэтых вёсак, так і іх суседзямі, дзе гэта было малавыражана. У адзначаны перыяд менш увагі звяртаецца на такія святы, як Дысетуха і свята ў гонар святых Барыса і Глеба. За рэдкім выпадкам яны не ўзгадваліся рэспандэнтамі. Трэба адзначыць і тое, што святу пад назвай Зылынэць надавалася значна больш пашаны пры высвячэнні зёлак, чым святу ў гонар Іаана Хрысціцеля. У працах папярэдніх даследчыкаў адзначалася, што Зелянец (Дыветуха) быў больш распаўсюджаным і вядомым сярод прадстаўнікоў каталіцкай канфесіі, аднак праведзеныя палявыя даследаванні дазваляюць сцвярджаць, што не меншае значэнне яно мела і для сялян праваслаўнага веравызнання.

Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з Ігнацюк П. С., 1937 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Балоты, 2018.

2. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з Ігнацюк Я. І., 1934 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Балоты, 2018.

3. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з Кавалюк Г. П., 1951 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Кісялёўцы, 2020.

4. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з Кавалюк М. Ф., 1944 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Кісялёўцы, 2020.

5. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з Кірыеўскай Н. А., 1987 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Магдалін, 2021.

6. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з Кіслюк Н. С., 1948 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Балоты, 2019.

7. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з Курышка А. М., 1937 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Балоты, 2020.

8. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з Курышка В. К., 1936 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Балоты, 2020.

9. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з Турын В. М., 1931 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Балоты, 2020.

10. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з Шварко К. Ц., 1913 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Балоты, 2019.

11. Валодзіна, Т. В. Лекавальная магія ў кантэксце каляндарнага свята / Т. В. Валодзіна // ARCHE. – 2011. – № 7–8. – С. 262–285.

12. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 4. Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.] ; ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2008. – 559 с.
13. Этнокультурные процессы Западного Полесья (Брестчины) в прошлом и настоящем / А. В. Гурко [и др.] ; науч. ред. А. В. Гурко ; Нац. акад. наук Беларуси, Центр исслед. белорус. культуры, языка и лит., Ин-т этнографии и фольклора им. Кондрата Крапивы. – Минск : Беларус. навука, 2020. – 621 с.

**К содержанию**

УДК 93

**М. В. КУКСЁНОК**
Полоцк, ПГУ
Научный руководитель – Е. В. Сумко, канд. ист. наук, доцент

## ВОСПОМИНАНИЯ КАК ИСТОЧНИК ПО ИЗУЧЕНИЮ ИСТОРИИ НОВОПОЛОЦКА

В статье отмечается особое значение воспоминаний как источника по изучению истории Новополоцка. В качестве примера автор приводит фрагменты воспоминаний горожан из фондов УК «Музей истории и культуры г. Новополоцка».

На современном этапе развития исторической науки ученые все чаще обращаются к микроистории. Изучение истории отдельных городов и регионов, которые долгое время были вне поля зрения исследователей, выходит на передний план. В их числе история Новополоцка – одного из молодых городов Беларуси, который своим возникновением обязан строительству нефтеперерабатывающего завода.

При изучении истории Новополоцка важным представляется обращение к воспоминаниям горожан. По утверждению В. В. Кабанова, «воспоминания способны восстановить множество фактов, которые не отразились в других видах источников. Мемуарные частности могут иметь решающее значение для реконструкции того или иного события» [6, с. 133].

Особый интерес представляют воспоминания новополочан из фондов УК «Музей истории и культуры г. Новополоцка». Рукописи и машинописные тексты содержат обширный материал и позволяют получить представление о различных аспектах жизни города. Коллекция воспоминаний по истории города начала формироваться во второй половине 1990-х гг. Анализируя даты написания воспоминаний, мы можем

предположить, что в преддверии 40-летия города сотрудниками музея проводилась целенаправленная работа в этом направлении. Следующая группа воспоминаний датирована началом 2000-х гг. Данный факт можно объяснить приближением очередного юбилея города и подготовкой к созданию экспозиции музея. Необходимо отметить, что с просьбой поделиться воспоминаниями музейные специалисты обращались не только к тем, кто на момент сбора информации проживал в Новополоцке. В фондах музея содержатся воспоминания первостроителей, руководителей предприятий, организаций, которые в связи с изменившимися жизненными обстоятельствами переехали из Новополоцка в другие населенные пункты. В результате во второй половине 1990-х – начале 2000-х гг. сотрудниками музея были собраны уникальные материалы по истории города. В последующие годы поступление воспоминаний не было систематическим, однако коллекция воспоминаний постепенно пополняется в связи с разработкой определенных тематических экспозиций.

Какие же сведения может получить исследователь, если обратится к воспоминаниям новополочан? В первую очередь, изучая воспоминания жителей Новополоцка, мы обращаем внимание на информацию о том, каким образом они узнали о строительстве города, из каких регионов приехали, какое имели образование.

Например, первостроитель Евгения Андреевна Маркевич (Павлова) вспоминает: «Около Полоцка, в деревне Ксты, жил мой дядя. Он взялся помочь мне получить паспорт и устроиться на работу. Я ходила на случайные подработки в Полоцк (разгружали вагоны, убирали снег с путей и т. д.). С паспортом так ничего и не получилось. От молодежи я узнала, что идет “вербовка” на новостройку. Пошла, записали, назначили срок прибытия в деревню Слобода. И вот, 6-е июня 1958 года. Я иду пешком со Кстов в Слободу на работу (и без паспорта!)» [2, с. 1–2].

«Когда-то мы – девчонка с юга России, с казачьего Дона и белорусский парень из Витебской области – встретились в московском вузе. Окончив его, поженились и став инженерами-строителями, начали свой трудовой путь в Подмосковье. Рядом Москва, друзья-однокурсники, хорошие перспективы в работе и дальнейшей жизни. Но… судьба вдруг круто изменила наш путь: приехав в Белоруссию в отпуск, мы увидели начинающуюся грандиозную стройку, ставшую всесоюзной комсомольской: строительство нефтехимического гиганта и нового города на берегу Двины вблизи древнего города Полоцка. Шел 1960-й год. Вокруг– молодые энтузиасты ребята, приехавшие из разных мест страны, будущие строители и жители нового города. И нам захотелось остаться и тоже строить город будущего», – рассказывает первый руководитель проектной мастерской Алла Александровна Фурс [3, с. 1–2].

Следующий важный момент в истории города – решение жилищного и других бытовых вопросов. Где проживали первостроители Новополоцка? Каким образом было организовано питание? Как они добирались на стройплощадку? Ответы на эти и другие вопросы находим на страницах воспоминаний. «Жили по деревням: в Слободе, в Охотнице, в Середоме, в Гвоздово, в Подкастельцах, в Махирово, в 1-й Баравухе. На машине привозили горячие обеды к первой палатке. Обедали прямо на земле, потом соорудили столы. Ветер подует, а песок – в суп» [2, с. 4]. «Первые дни по прибытии на стройплощадку в августе 1958 г. меня, как молодого специалиста, только что окончившего институт, прямо сказать, ошарашили, – делится воспоминаниями первостроитель Эдуард Антонович Шиманский. – Во-первых разместили нас с жильем на частных квартирах (домах) в Боровухе I, а это в десяти километрах от стройки, во-вторых штатных единиц мастеров не хватало и поэтому оклады нам назначили самые минимальные (на то время 900 руб. в месяц), а нагрузка на мастера была такая, как сейчас по количеству людей в строительном управлении» [5, с. 1].

Воссоздать картину начала строительства города, завода позволяют воспоминания первостроителя Алексея Петровича Ильина: «С января 1960 года начал работать на нефтеперерабатывающем заводе техником-геодезистом отдела генплана. На заводе нас тогда было всего 27 человек. К тому времени строились только объекты складского хозяйства. Чтобы продолжить строительство завода, нужна была геодезическая основа. И вот мы геодезисты, нас было тогда 2 геодезиста и 2 рабочих, приступили к выноске в натуру проектов осей основных дорог и контуров первых технологических установок. Были трудности, как и у всех первопроходцев: бездорожье, неустроенность, отсутствие транспорта для доставки людей к месту работы и обратно» [1, с. 1].

О становлении и развитии отделения связи рассказывает первый начальник предприятия Сергей Наумович Хацкевич: «Первое отделение связи открылось 21 ноября 1958 года и называлось оно “Пионерный городок”. Разместилось отделение связи в общежитии № 12. Устроились богато, по тем временам, имели 4 комнаты. В одной само отделение связи, в другой – кладовая, в третьей – наше жилье (стояли две кровати, на случай если домой не уедешь), а в четвертой… четвертую у нас позже отняли и поселили две девушки с УНР 121. Зимой 1958–1959 года наше отделение связи было своеобразным клубом, куда шли не только за свежей газетой или журналом, но и за добрым словом, за поддержкой друг к другу. Здесь не раз разгорались кратковременные дискуссии на любые темы, нередко почта была местом встречи влюбленных. Мы всех

проживающих в общежитиях, а их было около 600 человек, знали по имени и фамилии» [4, с. 3–4].

На страницах воспоминаний встречаем также сведения по организации досуга горожан. Например: «И у нас созрело решение; мы попросили отдать молодежи старую столовую, которую временно соорудили летом 1958 года на берегу Двины в районе теперешних коттеджей, – вспоминает Эдуард Антонович Шиманский. – Сооружение это было предназначено под слом, так как свои функции уже выполнило, и поэтому нам пошли навстречу. Но условие поставили одно: материалами руководство обеспечивало, а вот привести в надлежащий вид, чтобы можно было там проводить вечера, предлагалось на общественных началах. Вот здесь еще раз на деле был показан энтузиазм и молодой задор строителей. Никто не отказывался после работы придти и 2–3 часа отдать на общее дело, поработать по своей специальности, чтобы превратить бывшую столовую в молодежный клуб. Трудно вспомнить сейчас всех, кто принимал участие в этой работе, но через 2–3 недели были перестелены полы, оклеены стены, проведена покраска потолков и столярки и клуб заработал. Там проводились и собрания, и танцы, и занятия самодеятельности, в общем, это помещение еще больше сплачивало молодежь, не надо было ездить в Полоцк, да и время экономилось» [5, с. 3–4].

Как видим из приведенных выше фрагментов, воспоминания позволяют получить различные сведения и имеют огромное значение в изучении истории Новополоцка.

Список использованной литературы

1. Автобиография Ильина Алексея Петровича // Фонды УК «Музей истории и культуры г. Новополоцка». – КП 3790.

2. Воспоминания Маркевич (Павловой) Евгении Андреевны // Фонды УК «Музей истории и культуры г. Новополоцка». – КП 2874.

3. Воспоминания Фурс Аллы Александровны // Фонды УК «Музей истории и культуры г. Новополоцка».

4. Воспоминания Хацкевича Сергея Наумовича «Пионерный городок» // Фонды УК «Музей истории и культуры г. Новополоцка». – КП 10729.

5. Воспоминания Шиманского Эдуарда Антоновича // Фонды УК «Музей истории и культуры г. Новополоцка». – КП 3854.

6. Кабанов, В. В. Источниковедение истории советского общества : курс лекций [Электронный ресурс] / В. В. Кабанов. – М., 1997. – Режим доступа: http://opentextnn.ru/old/history/istochnik/kabanov/index.html. – Дата доступа: 24.03.2021.

**К содержанию**

УДК 394.014

**М. Г. ПАВЛЮКОВЕЦ**
Брест, БрГУ имени А. С. Пушкина
Научный руководитель – В. Ю. Пилипович, ст. преподаватель

# СПЕЦИФИКА ЭТНОГРАФИЧЕСКОГО ИССЛЕДОВАНИЯ ГОРОДСКОГО СОЦИОКУЛЬТУРНОГО ПРОСТРАНСТВА

Статья посвящена рассмотрению городского пространства как предмета для этнографического исследования. Показаны отличительные черты этнографии города, и приведена краткая история изучения.

Социокультурное пространство города является средой интеграции различных сфер человеческой деятельности, которым присущи свои традиции и ценности. Урбанизационные и миграционные процессы обеспечивают приток и развитие в городском пространстве как различных идей, новшеств, изобретений, так и всевозможных пороков. Соответственно, население города является своеобразным «слепком» прогресса и деградации. Вместе с тем необходимо отметить, что именно город чаще всего являлся флагманом социально-политического и экономического развития. В городском пространстве наблюдается высокая интенсивность обмена информацией, культурно-духовное многообразие, постоянное взаимодействие представителей различных субкультур и образование новых социальных отношений. Очевидно, что городской уклад жизни выходит за рамки традиций, формировавшихся испокон веков в малых населенных пунктах – деревнях и селах. Особенностью города является его специфическая инфраструктура, которая тесно вплетена в жизнь горожан. Все вышеперечисленные факторы делают изучение городского пространства достаточно сложным, но, одновременно, и перспективным. Этнографическое изучение города позволяет нам разобраться в его сложной социальной структуре, понять специфику взаимодействий разных социальных групп, определить роль этих групп в формировании самого города. Изучая городскую повседневность, мы одновременно реконструируем прошлое города, наблюдаем современность и можем очертить перспективы и проблемные точки развития.

В разные периоды времени исследованием социокультурного пространства города занимались этнографы, социологи, историки, филологи, искусствоведы, философы и др. [3]. Становление города как пример развития цивилизации рассматривается в трудах европейских исследователей М. Вебера, Г. Зиммеля, О. Шпенглера [4, с. 134]. Идея изучения города как социокультурного явления была разработана такими социологами, как Р. Редфилд и У. Уорнер. Данный подход предлагает рассмат-

ривать в первую очередь психологические проблемы горожан, возникающие под влиянием окружающего сложно устроенного пространства. Суть идеи исследований заключалась в рассмотрении города как биосоциального организма с особыми психологическими свойствами [5, с. 5]. Геокультурные характеристики городского пространства изложены в трудах С. Хантингтона [5, с. 6], а результаты изучения роли городских культурных объектов в духовном развитии горожан можно найти в трудах О. Е. Трущенко, В. Л. Глазычева и т. д. [2, с. 25].

Известно, что попытки исследования белорусских городов предпринимались еще со времен Российской империи, но они не носили системный характер, не затрагивали глубинные проблемы городской жизни. В основном исследователи давали характеристику жизни царской и княжеских семей, богатой части жителей города. Известны, например, работы И. Е. Забелина по вопросам быта русских царей и цариц, а также истории Москвы. Идея изучения быта разных общественных групп также присутствовала, но не получила должного распространения [1, с. 5].

Систематическое этнографическое исследование городов началось только в 1920–1930-е гг. Главным объектом исследования являлись рабочие фабрик и заводов, так как представители других профессий (работники банка, учителя, чиновники и т. д.) не считались прогрессивными и не занимали ведущей роли в жизни советского общества, поэтому оказались «на обочине» исследовательского интереса. Многие ученые продолжали работать по традициям еще дореволюционных исследователей и собирали в большей мере лишь статистические материалы по условиям труда, времени работы и отдыха рабочих методом анкетирования или интервьюирования [1, с. 2].

Этнография в тот период была отнесена к второстепенным историческим дисциплинам, так как, согласно советской идеологии, все народы советского пространства ко времени достижения индустриального развития потеряют свои национальные особенности и образуют однородное общество, и потому этнография в исторической науке в будущем больше не будет актуальна. Данный подход обусловил крайне непродуктивное изучение городского пространства, что заставило исследователей пересмотреть существующие подходы [2, с. 11–13].

Поэтому в 1950–1960-е гг. этнографы сделали акцент на семейно-бытовые вопросы горожан, начали исследоваться разнонациональные браки, молодежь, воспитываемая в таких семьях. Изучению подлежали различные стороны быта: жилище, одежда, питание, общественные праздники, род занятий и отдыха; рассматривались демографические вопросы, процесс адаптации отдельных групп приезжего населения в новой социокультурной среде и их взаимодействие с коренными городскими

жителями. Несмотря на идеологический диктат, в этот период наблюдается развитие этнографии города [1, с. 3].

Важно отметить, что в советское время изучение города проходило при активном использовании материалов по этнографии села, поскольку рост числа городских жителей происходил за счет приезжего населения из сельской местности. Такой подход позволял проследить, как носитель традиционной культуры взаимодействует с новыми порядками, а также оказывает ли сам влияние на окружающий социум [1, с. 5]. Начавшиеся с 1960-х гг. активные этнографические исследования продолжаются до настоящего времени. Труды, написанные советскими этнографами, используются современными исследователями в качестве дополнительных источников по разным изучаемым периодам, проблемам и методам работы. Среди российских этнографов изучением городского пространства занимались Г. П. Григорян, В. П. Конецкая, О. В. Костина, И. А. Манкевич, М. М. Назаров и др. [5, с. 6]. Среди белорусских ученых можно выделить таких, как Н. Я. Гринблант, Л. А. Молчанова, В. К. Бондарчик, Л. В. Ракова, И. Р. Углик и т. д. [6, с. 2].

Ужо да пачатку эпохі Такугава (1600–1867 гг.) з'явіліся вядомыя арганізацыі бакута, хоць афіцыйна азартныя гульні былі строга забароненыя законам. Пазней урад распрацаваў прагматычную палітыку таемнай дапамогі найбольш уплывовым лідарам бакута для забеспячэння магчымасці маніпуляваць імі ў сваіх мэтах. У гэты ж час верхаводы бакута папоўнілі шэрагі паліцэйскай агентуры. Як і тэкія, першыя бакута распрацавалі сістэму правілаў, што ўключала ў сябе строгае захаванне сакрэтнасці, вернасць прынцыпам "аябун-кобун" і строгую ўнутраную іерархічную сістэму. З тымі, хто парушаў правілы, абыходзіліся вельмі жорстка – баязлівасць, непадпарадкаванне і разгалашэнне таямніцы лічыліся не толькі здрадай, але і ўдарам па рэпутацыі і гонару самой групоўкі. Не лічачы смяротнага пакарання, выключэнне з банды лічылася самай цяжкай формай пакарання. Пасля адхілення парушальніка аябун папярэджваў іншыя групоўкі бакута пра тое, што дадзены чалавек больш не з'яўляецца членам яго банды; існавала пагадненне, згодна з якім ізгой не мог уступіць у банды канкурэнтаў [2, с. 68].

За сур'ёзныя парушэнні, што не заслугоўваюць пры гэтым смяротнага пакарання ці выгнання, бакута ўвялі традыцыю юбіцумэ – рытуальнага адразання фалангі пальца, пачынаючы з апошняй фалангі мезенца, у знак адданасці клану і непасрэдна аябун. Юбіцумэ быў прызваны паступова аслабляць руку, тым самым пазбаўляючы магчымасці трымаць меч гэтак жа моцна і ўпэўнена, як раней, і робячы яго больш залежным ад аябун і яго абароны. Звычайна адрэзаную фалангу ўручалі аябун у знак прабачэння [5, с. 102].

Традыцыя юбіцумэ была пасля пераняртая тэкія і іншымі злачыннымі групоўкамі.

Іншая адметная рыса сучасных якудза – татуіроўкі – таксама атрымала сваю папулярнасць менавіта сярод бакута. Першапачаткова нанясенне татуіроўкі з'ўлялася пакараннем, якое ўлады выкарыстоўвалі для таго, каб "ізаляваць" злачынцаў ад астатняга грамадства; звычайна за кожнае ўчыненае злачынства было па адной татуіроўцы ў выглядзе чорнага кальца вакол пляча. Акрамя таго, існавалі яшчэ і больш традыцыйныя японскія татуіроўкі, якія прадстаўлялі сабой суцэльную кампазіцыю з малюнкаў знакамітых багоў, легендарных герояў, жывёл або кветак, часам займалі ўсё цела. Такія татуіроўкі сталі папулярнымі сярод бакута ў канцы XVII ст., сімвалізуючы мужнасць і цягавітасць, так як працэс іх нанясення быў вельмі доўгім, складаным і балючым. З іншага боку, такія татуіроўкі

станавіліся для якудза своеасаблівым “таўром”, што назаўжды аддзяляе іх ад астатняга японскага грамадства. Як і ў выпадку з юбіцумэ, нанясенне татуіровак таксама было перанята іншымі злачыннымі групоўкамі [3, с. 88].

Бакута вартыя ўвагі не толькі як заснавальнікі вышэйзгаданых традыцый якудза, але і як першыя злачынныя групоўкі, афіцыйна прызнаныя японскімі ўладамі і якія пачалі супрацоўніцтва з імі. Бакута былі карысныя ўладам тым, што вярталі ім грошы, якія выплачваюцца ў якасці жалавання нанятым імі рабочым. З’яўляючыся прафесіяналамі ў галіне азартных гульняў, бакута выігрывалі ў рабочых гэтыя сродкі і вярталі іх уладам, атрымліваючы пэўны працэнт у якасці ўзнагароды за сваю працу [1, с. 95].

Спецыялісты сцвярджаюць, што сёння якудза ўяўляе сабой неад’емнны інстытут японскага капіталістычнага ладу. Яе станаўленне абумоўлена далёкім мінулым, калі ўзніклі папярэднікі арганізацыі – бакута і тэкія, якія на працягу свайго развіцця ўвабралі і выпрацавалі розныя звычаі, асаблівасці цырыманіялу, спосабы адносін з уладамі, якія сталі традыцыйнымі і прасочваюцца ў нашы дні. Японская паліцыя дагэтуль класіфікуе розныя групоўкі якудза па іх прыналежнасці або да тэкія, або да бакута.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Баландин, А. В. Финансовые группы Японии / А. В. Баландин // Банк. дело. – 2007. – № 11. – С. 94–99.

2. Дискуссионные проблемы японской истории : сб. ст. / АН СССР, Ин-т востоковедения ; отв. ред. и авт. предисл. А. Е. Жуков. – М. : Наука, 1991. – 175 с.

3. Caplan, D. E. Yakuza: Japan’s Criminal Underworld / D. E. Caplan, A. Dubro. – Los Angeles : University of California Press, 2003. – 422 p.

4. Reilly Jr., E. F. Criminalizing Yakuza Membership: A Comparative Study of the Anti-Boryokudan Law / E. F. Reilly Jr. // Washington University Global Studies Law Review. – 2014. – Vol. 13, is. 4. – P. 801–829.

5. Lewis, M. J. Rioters and Citizens: Mass Protest in Imperial Japan / M. J. Lewis. – Los Angeles : University of California Press, 1990. – 314 p.

6. Цветов, В. Я. Мафия по-японски / В. Я. Цветов. – М. : Политиздат, 1985. – 88 с.

7. В Японии количество членов якудза снижается 14 лет подряд [Электронный ресурс] // Nippon.com. – Рэжым доступу: https://www.nippon.com/ru/behind/yjj2018041200518/. – Дата доступу: 27.03.2021.

**К содержанию**

УДК 323.111:321.01(575.4+5-191.2)

**П. Ю. ЗЯЛЕВІЧ**
Брэст, БрДУ імя А. С. Пушкіна
Навуковы кіраўнік – Т. М. Мілач, канд. гіст. навук, дацэнт

# ТУРКМЕНІСТАН І НАЦЫЯНАЛЬНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАЕ РАЗМЕЖАВАННЕ Ў ЦЭНТРАЛЬНАЙ АЗІІ ПАЧАТКУ 1920-Х ГГ.

У артыкуле аналізуецца працэс размежавання ў Цэнтральнай Азіі ў 1920-я гг. Гэтае размежаванне праводзілася на аснове нацыянальнасці альбо этнічнай прыналежнасці жыхароў. Аўтар апісвае ўсталяванне дзяржаўных меж, заснаванае на прынцыпе нацыянальнага размежавання. Гэта быў яскравы прыклад стварэння нацыянальнай дзяржавы мірным шляхам. Рэформы паўплывалі на развіццё народа Туркменістана і далі туркменам магчымасць атрымаць сваю дзяржаўнасць.

Цэнтральнаазіяцкі рэгіён часта называюць “Еўразійскімі Балканамі”. Гэта тэрыторыя праблемная па сваім нацыянальным складзе і з’яўляецца сукупнасцю патэнцыяльных нацыянальна-тэрытарыяльных супярэчнасцей паміж народамі і рэспублікамі пасля распаду СССР у 1991 г. Туркменістану ў дадзенай сітуацыі давялося без сур’ёзных сутыкненняў на нацыянальнай глебе ўнутры краіны і тэрытарыяльных прэтэнзій звонку мірна ступіць у новае тысячагоддзе.

Туркменія – афіцыйная назва Туркменістан – дзяржава ў Цэнтральнай Азіі. Мяжуе з Афганістанам і Іранам на поўдні, з Казахстанам і Узбекістанам на поўначы, абмываецца Каспійскім морам на захадзе, выхаду да Сусветнага акіяна не мае. Незалежнасць краіны была абвешчана 27 кастрычніка 1991 г. Што ж абумовіла дзяржаўнасць, незалежнасць і сучасныя межы гэтай краіны? Карані гэтых набыткаў туркменскага народа, якія робяць Туркменістан паўнавартасным суб’ектам міжнароднага права, сягаюць у сярэдзіну 20-х гг. XX ст., калі быў закладзены падмурак сучаснай нацыянальнай дзяржаўнасці цэнтральнаазіяцкіх рэспублік.

Нацыянальна-дзяржаўнае размежаванне савецкіх рэспублік Цэнтральнай Азіі – тэрытарыяльна-дзяржаўныя пераўтварэнні 1924–1925 гг., ажыццёўленыя савецкай дзяржавай на аснове свабоднага волевыяўлення народаў Цэнтральнай Азіі і нацыянальнай палітыкі, якая праводзілася камуністычнай партыяй; адзін з этапаў будаўніцтва саюзнай савецкай сацыялістычнай дзяржавы. Стварэнне савецкай нацыянальнай дзяржаўнасці народаў Цэнтральнай Азіі пачалося з перамогай Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. Аднак шэраг аб’ектыўных прычын (эканамічная і культурная адсталасць краю, складанасць нацыянальных адносін, якія засталіся ў спадчыну ад царызму, барацьба з басмацтвам, супраціў мясцовых нацыяналістаў і інш.) некалькі затармазіў гэты працэс [4].

У мэжах рэалізацыі сваёй нацыянальнай палітыкі бальшавікам давялося першапачаткова падзяліць насельніцтва Туркестана на кіргізаў, узбекаў і туркменаў, каб стварыць для іх адпаведныя "суверэнныя" рэспублікі. Для легітымацыі сваіх «каласальных нацыянальных пераўтварэнняў» ім была неабходна група навукоўцаў, гатовых стварыць адзіную афіцыйную наменклатуру "карэнных народаў" Цэнтральнай Азіі і пазбавіцца ад дзясяткаў этнаграфічных груп. Такая праца была ўскладзена на спецыяльную камісію па вывучэнні племяннога складу насельніцтва Расіі і сумежных краін, што дзейнічала пры Расійскай акадэміі навук [3].

Адным з членаў гэтай камісіі быў вядомы ўсходазнаўца І. І. Зарубін. Ім і яго калегамі была праведзена вялікая праца па пераўтварэнні "карэннага насельніцтва" Цэнтральнай Азіі ў "туркменаў", "кіргізаў" і "ўзбекаў" [4]. Галоўным арганізатарам і ідэолагам гэтай кампаніі было Сярэднеазіяцкае бюро ЦК ВКП (б), або Сярэдазбюро ЦК ВКП (б), – вярхоўны орган ЦК ВКП (б) у Цэнтральнай Азіі. Бюро актыўна функцыянавала з 19 мая 1922 па 2 кастрычніка 1934 г. Асноўнай функцыяй было стварэнне і кіраўніцтва кампартыямі Туркестанскай АССР, Бухарскай і Харэзмскай народных савецкіх рэспублік, а пасля ўтварэння ў 1924 г. Узбекскай ССР, Туркменскай ССР, Таджыкскай АССР і Кіргізскай (Казахскай) ССР – партыйнае і дзяржаўнае будаўніцтва ў гэтых рэспубліках [2].

У 1917 г. тэрыторыя Туркменіі ўваходзіла ў склад Закаспійскай вобласці і Бухарскага эмірату. 30 красавіка 1918 г. на 5 Краёвым з'ездзе Саветаў (Ташкент, 20 красавіка – 1 мая) была абвешчана Туркестанская Савецкая Федэратыўная Рэспубліка. У дакументах з'езда было напісана: "Туркестанская Савецкая Федэратыўная Рэспубліка, кіруючыся аўтаномна, прызнае і каардынуе свае дзеянні з цэнтральным урадам Расійскай Савецкай Федэрацыі" [1]. У склад ТСФР увайшла тэрыторыя былога Туркестанскага краю, які ўключаў Закаспійскую, Самаркандскую, Сямірэчанскую, Сырдар'інскую і Ферганскую вобласці.

У ліпені 1918 г. у Закаспійскай вобласці пры падтрымцы англічан уладу захапілі эсэры і меншавікі. Сюды ўступілі англійскія войскі. Грамадзянская вайна і замежная інтэрвенцыя працягваліся каля паўтара года. У ліпені 1919 г. Чырвоная армія заняла Ашхабад, а ў лютым 1920 г. – Краснаводск. Англійскія войскі былі выгнаныя з Туркестана.

Туркмены масава пражывалі ў Туркменскай вобласці Туркестанскай АССР, на поўдні Бухарскай рэспублікі (Чарджуйская вобласць), у паўднёвай і паўднёва-заходняй частках (Туркменская і Ташаузская вобласці) Харэзмскай рэспублікі, былі ў меншай ступені, чым аселае насельніцтва, прадстаўленыя ў савецкіх органах улады і першымі выступілі ў Туркестанскай АССР з ініцыятывай стварэння асобных нацыянальных раёнаў у складзе рэспублікі ў 1921 г. [2].

Варта адзначыць, што яшчэ напярэдадні размежавання былі ўтвораны Таджыкская і Туркменская вобласці ў Бухарскай рэспубліцы, а таксама Туркменская вобласць у Туркестанскай АССР. Быў праведзены адміністрацыйны падзел Харэзмскай рэспублікі, і былі створаны ў 1921 г. вобласці з перавагай у кожнай з іх той ці іншай нацыянальнасці – туркменаў, узбекаў, каракалпакаў [6].

11 мая 1924 г. Сярэднеазіяцкае бюро ЦК РКП(б) палічыла неабходным утварыць Туркменскую рэспубліку на правах незалежнай савецкай сацыялістычнай рэспублікі. На працягу лета 1924 г. над справай нацыянальнага размежавання Цэнтральнай Азіі працаваў шэраг камісій. Да восені папярэдняя распрацоўка пытання была скончана [3].

19 верасня 1924 г. Пяты Усебухарскі, а 29 верасня 1924 г. Пяты Усехарэзмскі курултай Саветаў выказалі "братэрскую згоду на ўваходжанне туркменскага народа Бухары ў склад будучай Туркменскай ССР". Трэцяй Надзвычайнай сесіяй ЦВК Туркестанскай АССР 15 верасня 1924 г. быў прыняты Закон аб правядзенні нацыянальна-дзяржаўнага размежавання Туркестанскай АССР [6]. У выніку яго на тэрыторыях ТАССР, Бухарскай і Харэзмскай сацыялістычных савецкіх рэспублік была ўтворана Туркменская савецкая сацыялістычная рэспубліка (27 кастрычніка 1924 г.), а ў лютым 1925 г. былі прынятыя Дэкларацыя аб утварэнні Туркменскай ССР і Пастанова аб добраахвотным уваходжанні яе ў склад СССР [7].

У Туркменскую ССР з Туркестанскай АССР увайшла тэрыторыя Туркменскай (былой Закаспійскай) вобласці ў ліку Палтарацкага, Мерўскага, Тэджэнскага і Краснаводскага раёнаў. З Харэзмскай рэспублікі – Ташаузская акруга; з Бухарскай рэспублікі – Чарджуйская, Керкінская акругі і Каліфскі туман Шырабадскага велаята (пастанова рэўкама Туркменскай ССР ад 4 снежня 1924 г.) [3].

Гэтая тэрыторыя размешчана паміж 35° 10' і 42° 45' паўночнай шыраты і 52° 45' і 66° 40' усходняй даўгаты (ад Грынвіча), займаючы плошчу ў 491,2 тыс. км$^2$. На захадзе Туркменістан абмываецца Каспійскім морам, на поўдні на працягу 1820 км мяжуе з Персіяй і Афганістанам, затым мяжа перасякае Амудар'ю за 22 км на ўсход ад Келіфа, далей мяжа ідзе ў паўночна-заходнім напрамку ўздоўж рэчышча Амудар'і, мяжуе з Узбекістанам і затым з Кара-Калпакскай аўтаномнай вобласцю Казахстана. На поўначы краіна мяжуе з Казахстанам. Мяжа маладой рэспублікі з іншымі цэнтральнаазіяцкімі ўтварэннямі пакуль не была праведзена. Галоўны горад Туркменістана – Ашхабад (Палтарацк) [4]. Рэспубліка першапачаткова падзялялася на акругі: Керкінскую, Ленінскую (пазней – Чарджуйскую), Мерўскую, Палтарацкую (пазней – Ашхабадскую) і Ташаузскую.

Тэрыторыя Цэнтральнай Азіі да нацыянальнага размежавання мела працягласць у 1 527 375 км². У выніку рэформы з Цэнтральнай Азіі вылучыліся Туркестанская Кіргізія з тэрыторыяй працягласцю ў 600 964 км² і Кара-Калпакія з тэрыторыяй у 103 349 км². Такім чынам, пасля размежавання Цэнтральная Азія мела тэрыторыю працягласцю ў 823 062 км². Туркменістану з гэтай плошчы дасталося 367 776 км², г. зн. 44 % [5].

Колькасць насельніцтва Цэнтральнай Азіі да размежавання складала 8 131 062 жыхары. Насельніцтва краіны туркменаў з гэтай лічбы складала 853 761 – гэта 10,5 %. Надзвычай істотнае значэнне мае размеркаванне насельніцтва на гарадское і сельскае ў кожным з новых дзяржаўных утварэнняў. У выніку рэформы ў маладой рэспубліцы гарадское насельніцтва складала 9,5 %, што кажа пра слабую ўрбанізацыю гэтай краіны [8].

Асновай эканомікі Цэнтральнай Азіі з'яўлялася сельская гаспадарка. Туркменія з'яўлялася вобласцю земляробча-жывёлагадоўчай [1]. У 1923–1924 гг. валавы даход ад сельскай гаспадаркі Цэнтральнай Азіі вызначаецца ў 454 738 тыс. руб. З гэтай сумы на краіну размяркоўвалася 28 220 тыс. руб., г. зн. 6,2 %. У Туркменіі было 13,6 % баваўнянай плошчы, 13,5 % ад агульнай плошчы садоў і вінаграднікаў. Параўнальна шмат мелася жывёліны – 1701 тыс. галоў, што складала 12,5 % ад усёй колькасці жывёліны ў Цэнтральнай Азіі, у сярэднім 10,2 галоў худобы на адну гаспадарку. Нарыхтоўкі воўны, гарбарнай сыравіны і кішак тут былі значныя. Вялікія масівы саксаула, што меліся на тэрыторыі краіны, не падвяргаліся яшчэ пакуль што распрацоўцы [7].

Нафтавыя радовішчы на востраве Чэлекен адышлі да новай савецкай рэспублікі. Усе віды паліўнай прамысловасці да нацыянальнага размежавання былі аб'яднаны ў адным прадпрыемстве – "Турктоптрэсце". Агульная вартасць гэтага прадпрыемства – 6114 тыс. руб. З гэтай сумы ў працэсе размежавання адышло да Туркменістана 1156 тыс. руб. Вялікую чыгуначную сетку мела новая краіна – 1364 вярсты. Аднак у Туркменіі чыгунка праходзіла па эканамічна менш развітых раёнах. З прычыны гэтага ў 1914 г. па той частцы сеткі, якая пралягае на тэрыторыі Узбекістана, было перавезена грузаў 109 678 тыс. пудоў, між тым як па чыгунках тагачаснага Туркменістана было перавезена за той час толькі 27 666 тыс. пудоў [5].

Бюджэт гэтай савецкай рэспублікі на першы год яе існавання быў складзены на суму 5,5 млн руб. Што ж датычыцца дзейнасці банкаў у маладых рэспубліках, то на 1 красавіка 1925 г. сетка цэнтральнаазіяцкіх крэдытных устаноў налічвала 55 філіялаў, з іх у Туркменістане знаходзілася 10. Паміж новымі рэспублікамі і абласцямі крэдытаванне ў красавіку – ліпені 1925 г. у крэдытным плане складала 12 % [3]. Агульная дзяржаўная маёмасная маса 75,3 млн руб., была размеркавана паміж новымі

рэспублікамі і абласцямі. У Туркменістане засталося 10,4 млн руб. – гэта 13,8 % ад агульнай сумы. На адну душу насельніцтва прыходзілася 13 руб., што паказвае сур'ёзныя намеры бальшавікоў падняць узровень жыцця, развіць эканоміку і падключыць гэтую краіну да эканамічных зносін з краінамі астатняга СССР [7].

Было захавана адзінае Упраўленне воднай гаспадаркі. Ірыгацыя, больш чым якая-небудзь іншая галіна гаспадаркі, патрабуе адзінства агульнага кіраўніцтва. Рэкі Цэнтральнай Азіі ўтвараюць тры галоўныя сістэмы: Амудар'ю, Сырдар'ю і Чу-Балхашскую сістэму. Амудар'я, за выключэннем Зераўшана, арашае Узбекістан і Туркменістан.

Правядзенне межаў абумовіла пытанне аб рэалізацыі прынцыпаў нацыянальна-палітычнага і эканамічнага функцыянавання дзяржавы. Нацыянальна-палітычны прынцып зыходзіў з нацыянальнага складу і пачатку адзінства тэрыторыі. Гэты прынцып браў за аснову перавагу той ці іншай нацыянальнасці, якая жыве кампактнай масай на дадзенай тэрыторыі, і выключаў магчымасць якіх-небудзь тэрытарыяльных перарываў. Эканамічны прынцып заключаўся ў правядзенні межаў такім чынам, каб прымаўся пад увагу кірунак эканамічнага прыцягнення, шляхі зносін, наяўнасць ірыгацыйных сістэм і г. д. З гэтых двух прынцыпаў у якасці асновы для размежавання быў узяты прынцып нацыянальна-палітычны, і толькі ў асобных выпадках рабіліся адступленні для прынцыпу эканамічнага. Акалічнасць гэтая прывяла да таго, што ў новых дзяржаўных утварэннях апынулася шмат агульных эканамічных інтарэсаў і задач. Аднак рэалізацыя абцяжарвалася цэлым шэрагам фактараў, якія патрабуюць кампрамісаў: стракатасцю нацыянальнага складу асобных тэрыторый, прыцягваннем тэрыторый да пэўных гандлёвых цэнтраў, шляхоў зносін, ірыгацыйных збудаванняў і г. д. Таму спробы змены "зверху" па этнапалітычным прынцыпе тэрытарыяльнай арганізацыі разбуралі сталыя гандлёва-эканамічныя ўзаемасувязі гэтага рэгіёна, паколькі яны былі закладзены яшчэ ў перыяд існавання папярэдніх дзяржаўных утварэнняў, накшталт Хівінскага ханства і Бухарскага эмірата, дзе ў незалежнасці ад межаў рассялення этнасаў існавалі свае агульныя эканамічныя цэнтры, у якіх перасякаліся гандлёва-гаспадарчыя сувязі народаў Цэнтральнай Азіі [4].

Нацыянальна-дзяржаўным размежаваннем туркменскаму народу была прадастаўлена магчымасць развівацца як нацыянальна-дзяржаўны этнас, быў зададзены істотны штуршок для мадэрнізацыі, падключэння да гаспадарчых сувязей новага дзяржаўна-палітычнага фарміравання – СССР, а таксама развіцця культуры. Усё гэта пасля распаду СССР зрабіла магчымым з'яўленне ў гэтым рэгіёне новай незалежнай дзяржавы на базе былой саюзнай рэспублікі.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Положение о Туркестанской Советской Федеративной Республике, утвержденное V съездом советов Туркестанского края, 30 апреля 1918 года [Электронный ресурс] // Викитека. – Режим доступа: https://ru.wikisource.org/wiki. – Дата доступа: 27.10.2020.

2. Ташенов, К. Т. Национально-государственное размежевание в Средней Азии и Казахстане / К. Т. Ташенов ; О-во по распространению полит. и науч. знаний КазССР. – Алма-Ата : [б. и.], 1960. – 39 с.

3. Варейкис, И Национально-государственное размежевание Средней Азии / И. Варейкис, И. Зеленский. – Ташкент : Сред.-Азиат. гос. изд-во, 1924. – 86 ст.

4. История Бухарской и Хорезмской Народных Советских Республик / ред. кол.: П. В. Волобуев [и др.]. – М. : Наука, 1971. – 253 с.

5. Масов, Р. История топорного разделения / Р. Масов. – Душанбе : Ирфон, 1991. – 189 с.

6. Турсунов, Х. Т. Коммунистические партии Туркестана, Бухары и Хорезма в период национально-государственного размежевания в Средней Азии / Х. Т. Турсунов ; Ин-т истории компартии при ЦК КП Узбекистана – фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – Ташкент : Госиздат УзССР, 1959. – 84 с.

7. Немченко, М. А. Национальное размежевание Средней Азии / М. А. Немченко. – М. : Литиздат НИКД, 1925. – 28 с.

8. Ходжаев, Ф. К истории революции в Бухаре и национального размежевания Средней Азии / Ф. Ходжаев. – 2-е изд., испр. и доп. – Ташкент : Гос. изд-во УаССР, 1932. – 190 с.

**К содержанию**

УДК 94(574) «1941/1945»

**Е. А. КАЛИНИНА**
Уральск, ЗКУ имени М. Утемисова
Научный руководитель – Т. З. Рысбеков, д-р ист. наук, профессор, почетный академик НАН РК

## ТРУДОУСТРОЙСТВО ЭВАКУИРОВАННОГО НАСЕЛЕНИЯ В ГОДЫ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ В ТЫЛУ (НА ПРИМЕРЕ Г. УРАЛЬСКА)

В годы Великой Отечественной войны Западно-Казахстанская область стала одним из первых регионов, ощутивших огромный поток эвакуированных. Позже она стала прифронтовой зоной Сталинградской битвы. Только за первые месяцы войны

сюда прибыло около 40 тыс. человек. Местные власти повсеместно решали вопросы медицинского и социального обеспечения, жилья и трудоустройства. Эвакуированные обычно соглашались на любую работу, чтобы быть полезными для фронта и получать продуктовые карточки. На примере Западно-Казахстанской области можно оценить, насколько ценились трудовой стаж и знания эвакуированных, нередко им предлагали должности, аналогичные тем, что они занимали на родине, или более высокие. Местные специалисты учились у эвакуированных мастеров и наоборот, поскольку после полномасштабного оттока местных специалистов на фронт уже в первые месяцы войны ощущался огромный кадровый дефицит. Работа, жилье, пособия, мед- и соцобеспечение предоставлялись всем. И хотя эвакуация в Уральск потребовала огромных усилий со стороны местных властей, но она же стала причиной создания новых экономических баз.

На механическом заводе г. Уральска «Совхозреммаштреста» с 1941 г. трудились 18 человек, эвакуированных сюда из г. Орехова Запорожской области УССР. Все они были разного возраста, от 1895 года рождения, как Михаил Ильич Дейнега, беспартийный, с низким уровнем образования, ставший здесь на заводе слесарем, как Абрам Моисеевич Хомский, 1927 года рождения, член ВЛКСМ, также не имевший полного среднего образования, но ставший слесарем V разряда. Домохозяйки из г. Орехова, согласно этому списку – Александра Бондаренко, 1910 года рождения, и Цыля Борисовна Львова, 1897 года рождения, – работали агентом снабжения и охранником завода соответственно [1, с. 1, л. 2].

Директором хлебокомбината в Уральске во время войны утвердили Моисея Менделевича Дермана, 1900 года рождения, который до войны в Днепродзержинске занимал аналогичную должность – директора хлебозавода [1, с. 2]. В Уральской государственной областной типографии работали два человека: Иосиф Яковлевич Эльперин, 1895 года рождения, и София Ефимовна Бондоренко, 1892 года рождения. Первый, имевший опыт работы печатником в школе ФЗО, здесь стал переплетчиком, а вторая – домохозяйка из Запорожской области – стала сторожем [1, с. 4]. На Уральском мясокомбинате трудились двое эвакуированных из Украины: Моисей Заенчик, 1907 года рождения (в г. Запорожье Запорожской области, имея 5 классов образования, он трудился заведующим магазином) здесь стал агентом по снабжению. Александра Андреевна Носовцева, 1920 года рождения, имеющая средне-специальное образование и работавшая до войны на алюминиевом комбинате медсестрой, здесь стала работницей холодильных установок [1, с. 6]. На Уральском заводе литейного и лабораторного оборудования трудились на разных должностях – от уборщицы до токаря и товароведа – шесть человек из Днепропетровской и Запорожской областей [1, с. 8]. На овчинно-шубном заводе г. Уральска трудились пять эвакуированных из Днепропетровской области УССР, занимая разные должности – от пошивщицы и слесаря до молотобойца [1, с. 10].

На Переметном механическом заводе трудились три человека, эвакуированных из УССР. Все трое с начальным образованием заняли такие же должности, что и до войны у себя на родине. Так, Георгий Петрович Невинный (1895 года рождения, в г. Орехове Запорожской области трудился начальником литейного цеха на авторемонтном заводе) стал начальником литейного цеха, Иван Никанорович Харьковский (1912 года рождения, слесарь того же завода) был слесарем, Аристарх Иванович Холодный (1892 года рождения, трудившийся кузнецом в колхозе имени Красной армии села Очеретоватое Магдалиновского района Днепропетровской области) работал кузнецом [1, с. 11].

Евгений Иванович Сонин, эвакуированный в октябре 1941 г. из Товарковского района Тульской области, занимал должность директора промкомбината Джаныбекского района Западно-Казахстанской области и даже вынужден был просить ЦК КП(б)К в 1944 г. освободить его от должности и направить к прежнему месту работы, поскольку местный обком, к которому он обращался дважды, не выполнял его просьбы [1, с. 24–26].

В других архивных фондах находится немало подобных примеров. Так, Шая Иосифорович Дучинский (1904 года рождения, трудившийся председателем райпотребсоюза в г. Богуславе Киевской области) стал заместителем председателя Облисполкома в г. Уральске, Павел Дмитриевич Баранов (1891 года рождения, трудился заведующим Облпартархивом в г. Николаеве) стал архивариусом в ОК КПбК. Александр Петрович Чернявский, 1908 года рождения, до эвакуации работал в г. Сумы, в ОК КП(б)У заведующим сектором отдела пропаганды. В Уральске он также трудился в ОК КП(б)К. Эстер Шаевна Малинская, 1914 года рождения, до войны работала заведующей школьным отделом в редакции журнала «Пионервожатый» г. Киева. В Уральске она стала специальным корреспондентом в газете «Приуральская правда» (ныне газета «Приуралье»). Николай Ефимович Гегельский, историк из Авдеевки Сталинской области, устроился военруком в школе № 12 г. Уральска (ныне в пос. Деркул) [2, с. 130–131, 118]. А. А. Дубовик, 1902 года рождения, врач туберкулезного диспансера из г. Ворошиловограда, стал заведующим Казталовским райздравотделом [2, с. 160], а простой тракторист, эвакуированный из с. Шевченко Николаевской области УССР, Павел Семенович Мусатов стал председателем райсовета Осоавиахима [2, с. 107].

Как минимум 172 человека, прибывших из Украины, работали учителями в школах Западно-Казахстанской области [2, с. 195–204]. Учителя нередко занимали и более высокие должности. Так, Степан Ефимович Колодий (1909 года рождения, учитель Глобинского района Полтавской области УССР) в ЗКО стал директором клуба в райцентре

Каменского района [2, с. 71]. Александр Георгиевич Ковазов, 1911 года рождения, работавший в Украине оперуполномоченным транспортного отдела НКВД, стал оперуполномоченным районного отдела НКВД г. Уральска. Степанида Ефремовна Кулак, 1905 года рождения, работавшая мастером цеха № 4 в Киеве, в Уральске стала начальником цеха Горпромкомбината [2, с. 132]. Начальник пожарной охраны Плодозавода Копайградского района Винницкой области Лейзер Ихелевич Долтус, 1900 года рождения, в Уральске стал рабочим в УВСР № 25, а Иосиф Исакович Островский, 1907 года рождения, работавший в Днепродзержинске уполномоченным Аптекоуправления, стал управляющим Облаптекоуправлением. Полина Ильинична Медник, 1896 года рождения, заведующая детским домом из Харькова, стала воспитательницей в доме ребенка, а Клавдия Ивановна Рыжкова, 1906 года рождения, воспитательница из Харькова, трудилась в той же должности в детском доме имени Калинина [2, с. 132, л. 2]. Надзиратель из г. Прилуки Черниговской области Иван Васильевич Яковенко, 1915 года рождения, стал надзирателем тюрьмы в Уральске, а Дору Матвеевну Торбину, 1911 года рождения, до войны занимавшую должность начальника цеха у себя на родине в Сумской области, в Уральске назначили на должность мастера школы фабрично-заводского обучения (ФЗО). Моисей Вениаминович Лобков, 1911 года рождения, до войны был токарем кооперации инвалидов из Киева, в Уральске стал мастером-токарем школы № 30 [2, с. 134]. Борис Владимирович Остерников (1898 года рождения, механик Водтреста из г. Краматорска Донецкой области) стал директором кирпичного завода [2, с. 135, л. 2].

Ряды газеты «Приуральская правда» пополнили также Станислава Антоновна Лазарева, 1909 года рождения, из Николаева, имевшая опыт работы в газетах и журналах, Эсфирь Григорьевна Маклерович, 1911 года рождения, журналист с 8-летним стажем из г. Ворошиловграда [2, с. 136, л. 2].

ФЗО № 11 также пополнилась ценными украинскими кадрами. Так, слесарем-инструментальщиком этой школы стал Иван Петрович Гусаков, 1919 года рождения, из Самборского района Драгобычской области УССР, имевший к тому моменту 7-летний опыт в должности мастера, Макар Анисимович Лебедев, 1901 года рождения, жестянщик с 17-летним стажем из г. Рава-Русская Львовской области, Соцукевич Георгий Емельянович, 1909 года рождения, техник с 12-летним стажем из г. Львова, Никифор Миронович Бабенко, 1911 года рождения, слесарь из депо г. Харькова и Андрей Дмитриевич Левенец, 1895 года рождения, машинист с 12-летним стажем из Смоленского района Киевской области [2, с. 137]. Мариам Израилевна Цацкис (1912 года рождения, экономист-финансист из Киева)

стала начальником планового отдела Госпароходства Уральска [2, с. 138]. Борис Григорьевич Тульчинский (1906 года рождения, доцент с 10-летним стажем из Днепропетровска) стал заведующим кафедрой математики педагогического института, а Василия Антоновича Федорова (1899 года рождения, педагог с 14-летним стажем из Полтавы) назначили заместителем директора стройинститута г. Уральска [2, с. 138, л. 2]. Простой слесарь из г. Кременчуга Полтавской области стал мастером ремонтно-механического цеха кожевенного завода имени Землячки, эвакуированного в г. Уральск из Москвы [2, с. 139]. Технический руководитель Киевской валяльной фабрики № 2 из Киева Абрам Ноянович Мень, 1911 года рождения, занял аналогичную должность на фабрике «Красный Октябрь», а двое геодезистов из Киева – Александр Васильевич Заводовский и Мария Николаевна Мишнева (1902 и 1905 годов рождения соответственно) – пополнили ряды сотрудников Южного аэрогеодезического предприятия в г. Уральске [2, с. 146]. Аркадий Иосифович Лукашевич (1898 года рождения, директор мебельной фабрики из г. Ромны Сумской области) стал директором маслозавода [2, с. 147]. Несколько управляющих отделениями Госбанка из разных районов Сумской области Украины – Василий Ильич Чиликиди (1902 года рождения, управляющий Госбанком г. Сумы, сначала работал председателем райисполкома Бурлинского района), Иван Михайлович Захаров (1896 года рождения, управляющий Груньским отделением Госбанка в Сумской области), Александр Тимофеевич Петренко (управляющий банком в Краснопольском районе Сумской области) и П. И. Федотов (управляющий банком Смеловского района Сумской области) – в Уральске заняли аналогичные должности, возглавив отделения Госбанка Бурлинского, Зеленовского, Теректинского и Чингирлауского районов соответственно [2, с. 211, л. 2, с. 116, л. 2, с. 148, л. 2, с. 214]. Отправляя их обратно, власти заботились, чтобы были соблюдены следующие меры: «1. Со всеми отъезжающими по списку необходимо произвести полный расчет по месту работы в данное время с выдачей двухнедельного выходного пособия. 2. Обеспечить отъезжающих продуктами на все время дороги до места назначения» [2, с. 77].

Точное количество прибывших в ЗКО привести сложно. В ноябре 1941 г. эвакоотдел сообщает, что в область прибыло 37 153 человека, но только по 15 439 имеется списки [3, с. 250]. На 1 января 1942 г. эвакуированных в ЗКО насчитывалось не менее 37 958 человек, размещенных по 13 районам и в г. Уральске, и цифры об их количестве уже тогда разнились, о чем говорится в документах: «…из них взято по фамильному учету (по форме № 2) 20 541 человек, расхождение по списочному учету произошло по вине Уральского Горсовета, Урдинского, Теректинского, Бурлинского, Чингирлауского райисполкомов, руково-

дители которых до последнего времени не принимали необходимых мер к четкой организации списочного учета и работу запустили» [4, с. 1].

Список использованной литературы

1. Государственный архив Западно-Казахстанской области Республики Казахстан (ГА ЗКО). – Ф. П-37. Оп. 13. Д. 156 : Списки работников, рекомендуемых к правительственной награде и эвакуированных.

2. ГА ЗКО. – Ф. П-37. Оп. 12. Д. 20 : Списки эвакуированных коммунистов, размещенных по районам.

3. Сдыков, М. Н. История населения западного Казахстана / М. Н. Сдыков. – Алматы : Курсив, 2004. – 406 с.

4. ГА ЗКО. – Ф. П-37. Оп. 11. Д. 1077 : Материалы об эвакуированных предприятиях и населении. Отчеты.

**К содержанию**

УДК 94(437.3)

**А. С. КАНДРАЦЕНКА**
Мінск, БДУ
Навуковы кіраўнік – Л. А. Козік, канд. гіст. навук, дацэнт

## АСАБЛІВАСЦІ ПРАВЯДЗЕННЯ ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА 1940 Г. У СЛАВАЦКАЙ РЭСПУБЛІЦЫ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЕЙ

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці правядзення перапісу 1940 г. у Славакіі ў дачыненні да яе буйнейшых нацыянальных меншасцей: нямецкай, венгерскай, яўрэйскай, цыганскай, русінскай і чэшскай. Адлюстраваны нацыянальны склад насельніцтва Славакіі. Адзначаны змяненні ў дэмаграфічным вобразе Славацкай Рэспублікі ў выніку палітычных і сацыяльных фактараў напярэдадні і падчас Другой сусветнай вайны. Дадзена ацэнка падыходу славацкага ўрада ў вызначэнні прыналежнасці да нацыянальных меншасцей.

Страта тэрыторый і значнай колькасці насельніцтва па выніках Венскага арбітражу 1938 г., перададзеных Венгрыі, абцяжарыла працу аўтаномнага ўрада Славакіі, які быў створаны 6 кастрычніка 1938 г. у межах Другой Чэхаславацкай Рэспублікі. На павестцы дня было пытанне нацыянальных меншасцей. У сувязі з гэтым славацкі аўтаномны ўрад арганізаваў пазачарговы перапіс, падрыхтаваны Рэгіянальным дэпартаментам у Браціславе ў супрацоўніцтве з Міністэрствам унутраных спраў. Яго асноўнай мэтай было стварэнне нацыянальнага кадастру з дакладнай

інфармацыяй аб нацыянальных меншасцях у Славакіі. Перапіс павінен быў праводзіцца 31 снежня 1938 г.

Арганізацыя перапісу праходзіла без шырокага інфармавання пра яго, што было падвергнута крытыцы з боку лідара нямецкай меншасці Ф. Кармазіна. 31 снежня 1938 г. ён накіраваў скаргу старшыні аўтаномнага ўрада Славакіі Ё. Цісу, у якой адзначыў немагчымасць лічыць вынікі перапісу праўдзівымі па прычыне адсутнасці належнай інфармаванасці насельніцтва і правядзення перапісу за дзень [8, с. 547].

Унутрыпалітычная напружанасць і магчымае ўмяшальніцтва Германіі дзеля падтрымкі нямецкай меншасці ў Славакіі вымусіла аўтаномны ўрад не публікаваць вынікі перапісу [7, с. 30]. Безумоўна, гэта не адпавядала першапачатковай задуме стварэння нацыянальнага кадастру, які павінен быў паказаць колькасны склад этнічных меншасцей у Славакіі.

У кастрычніку 1940 г. славацкі ўрад пачаў працу па падрыхтоўцы перапісу насельніцтва, які планавалася правесці з 15 па 21 снежня 1940 г. Збор дадзеных ажыццяўляўся Дзяржаўным статыстычным дэпартаментам у Браціславе, які кіраваў дзейнасцю мясцовай адміністрацыі і асобных перапісных участкаў [5, с. 65].

Адной з галоўных асаблівасцей перапісу 1940 г. былі метады вызначэння прыналежнасці да пэўнай этнічнай групы. Так, прыналежнасць да канкрэтнай нацыянальнасці вызначалася валоданнем роднай мовы. Для аб'ектыўнасці дадзеных быў выкарыстаны прынцып практычнага ўжывання мовы.

Акрамя грамадзян, прысутных на момант перапісу, у выніковую лічбу былі ўключаны грамадзяне, якія адсутнічалі ў Славакіі падчас перапісу па розных прычынах. Так, насельніцтва Славацкай Рэспублікі складала 2 567 555 чалавек, а славакі складалі 86 % ад агульнай колькасці [6, с. 139].

Нямецкая меншасць была самай вялікай этнічнай групай у Славацкай Рэспубліцы. У 1940 г. па выніках перапісу яе колькасць склала 129 552 чалавекі, альбо 5,05 % ад усіх жыхароў Славакіі. У параўнанні з папярэднім перапісам 1938 г. колькасць немцаў вырасла. Заўважым, што падчас перапісу 1940 г. на славацкіх немцаў аказвала ціск Нямецкая партыя і яе лідар Ф. Кармазіна. Так, напрыклад, немцы г. Ніжні Медзеў у знак нязгоды з палітыкай партыі запісаліся венграмі, а за некалькі дзён да перапісу быў здзейснены замах на Ф. Кармазіна [4, с. 43].

Прадстаўнікі яўрэйскай нацыянальнасці былі другой па велічыні этнічнай групай у Славакіі. Іх налічвалася 74 438 чалавек. Пастанова славацкага ўрада № 63/1939 ад 18 красавіка 1939 г. давала азначэнне "яўрэй", у аснове якога было два крытэрыі – мова і веравызнанне [9]. Такім чынам, славацкія грамадзяне іўдзейскай веры, а таксама тыя, хто пасля

30 кастрычніка 1918 г. перайшоў з іўдаізму ў хрысціянства, аўтаматычна былі запісаны яўрэямі.

Па перапісе насельніцтва 1940 г. да русінскай этнічнай групы аднеслі сябе 61 762 чалавекі. У працэсе апрацоўкі дадзеных Дзяржаўны статыстычны дэпартамент сутыкнуўся з праблемай саманазвы гэтай нацыянальнай групы [6, с. 34]. Жыхары ўсходняй Славакіі называлі сябе русінамі, руснакамі, рускімі, гуцуламі, украінцамі ці маларусамі згодна са сваім дыялектам і культурнымі асаблівасцямі. У такой сітуацыі Дзяржаўны статыстычны дэпартамент выдаў 30 кастрычніка 1941 г. распараджэнне, якое абавязвала запісваць гэтых людзей як русінаў.

На тэрыторыі Славакіі пражывалі і венгры. Паводле перапісу насельніцтва 1940 г., іх налічвалася 46 689 чалавек, ці 1,8 % ад агульнай колькасці жыхароў. На думку венгерскіх палітыкаў, пры правядзенні апытання славацкі ўрад свядома занізіў колькасць венграў Славакіі. У якасці доказу маніпуляцый падчас перапісу лідар Венгерскай партыі Я. Эстэрхазі ў маі 1941 г. накіраваў прэм’ер-міністру Славакіі В. Туку спісы з 1147 славацкіх грамадзян венгерскай нацыянальнасці, якіх мясцовыя ўлады запісалі як славакаў ці немцаў [1, с. 106].

Яшчэ ў 1930 г. у Славакіі пражывала каля 120 000 чэхаў. Падчас працы аўтаномнага ўрада (восень 1938 г. – вясна 1939 г.) Браціслава дамаглася адпраўкі 9000 чэхаў – дзяржаўных служачых – у Чэхію [2, с. 87]. Пасля ліквідацыі Чэхаславакіі значная частка чэхаў, сярод якіх былі чыноўнікі, чыгуначнікі, ваенныя, суддзі, урачы і інш., была вымушана пакінуць Славакію. Аднак былі і выпадкі, калі, баючыся перасялення ў Пратэктарат Багеміі і Маравіі, яны запісваліся славакамі ці немцамі. Як вынік, на 1940 г. у Славакіі было зарэгістравана толькі 3024 прадстаўнікі чэшскай нацыянальнасці.

На тэрыторыі Славакіі па выніку перапісу 1940 г. было зарэгістравана 37 102 цыганы [3, с. 153]. Пастанова Міністэрства ўнутраных спраў Славацкай Рэспублікі ад 18 чэрвеня 1940 г. адносіла да цыган прадстаўнікоў цыганскай этнічнай групы, якія вялі качавы ці аседлы лад жыцця, але пазбягалі працы.

Можна сцвярджаць, што пры правядзенні перапісу 1940 г. славацкія ўлады выкарыстоўвалі дыскрымінацыйны падыход да яўрэяў і цыган, што праяўлялася ў неабходнасці праходзіць абавязковую рэгістрацыю для вызначэння нацыянальнай прыналежнасці. Праявы дыскрымінацыйнага падыходу можна бачыць і ў дачыненні да венграў, якіх нярэдка запісвалі як славакаў ці немцаў. У сваю чаргу да немцаў быў ужыты дыяметральна супрацьлеглы падыход. На нашу думку, гэта тлумачыцца тым, што славацкі ўрад успрымаў мясцовых немцаў як істотны чыннік у развіцці адносін паміж Славакіяй і Германіяй, а таму імкнуўся пазбягаць

абвастрэння міждзяржаўных адносін. З іншых асаблівасцей перапісу неабходна адзначыць права русінаў запісвацца як русіны, а не рускія ці ўкраінцы. Комплекс недаверу, які быў у чэшска-славацкіх адносінах у міжваенны перыяд, паўплываў на палітыку славацкага ўрада ў дачыненні да чэхаў, што прывяло да рэзкага скарачэння іх колькасці на тэрыторыі Славацкай Рэспублікі.

Такім чынам, можна канстатаваць, што падчас правядзення перапісу насельніцтва 1940 г. улады выкарыстоўвалі як дыскрымінацыйныя меры, так і розныя падыходы пры вызначэнні этнічных груп. Гэта ставіць пад сумненне аб'ектыўнасць сабраных дадзеных аб нацыянальным складзе Славацкай Рэспублікі на пачатку Другой сусветнай вайны.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Hetényi, M. The status of Hungarian minority in Slovakia in 1939 – 1940 / M. Hetényi // Slovensko medzi 14. marcom 1939 a salzburskými rokovaniami. – Prešov : Universum, 2007. – S. 93–111.

2. Mičko, P. Špecifiká postavenia českých zamestnancov na Slovensku počas druhej svetovej vojny vo verejnom, štátnom a súkromnom sektore / P. Mičko, Z. Hešterová // Acta historica Neosoliensia Vedecký časopis pre historické vedy – 20/2. – Banská Bystrica : Filozofická fakulta Univerzity Mateja Bela, 2017. – S. 87–104.

3. Nečas, C. Slovenští Romové v letech 1939–1945 / C. Nečas // Sborník prací Filozofické fakulty brněnské university. – Brno : Studia historica Brunensia, 2004. – S. 153–178.

4. Schvarc, M. Guľka pre štátneho tajomníka (Pokus o atentát na Franza Karmasina v Nižnom Medzeve 11. decembra 1938) / M. Schvarc // Pamäť národa. – Bratislava : Ústav pamäti národa, 2007. – № 4. – S. 42–50.

5. Šprocha, B. Reprodukcia obyvateľstva Slovenska počas druhej svetovej vojny, 3. Časť / B. Šprocha // Slovenská štatistika a demografia. – R. 26, 1. – Bratislava : Výskumné demografické centrum. – 2016. – S. 64–81.

6. Šprocha, B. Demografický obraz Slovenska v rokoch 1938–1945 / B. Šprocha, P. Tiŝliar. – Bratislava : Muzeológia a kultúrne dedičstvo, 2016. – 200 s.

7. Tišliar, P. Odraz národnostnej politiky Slovenskej republiky (1939–1945) v štatistickej praxi / P. Tišliar // Populačné štúdie Slovenska 4. – Bratislava : Muzeológia a kultúrne dedičstvo, 2014. – S. 21–57.

8. Schvarc, M. Tretia ríša" a vznik Slovenského štátu : dokumenty / M. Schvarc, M. Holák, D. Schriffl (eds.). – Bratislava : Ústav pamäti národa: SNM – Múzeum kultúry karpatských Nemcov, 2008. – 633 s.

9. Vládne nariadenie o vymedzení pojmu žida a usmernení počtu židov v niektorých slobodných povolaniach zo dňa 18. apríla 1939 [Электронны

рэсурс] // Ústav pamäti národa. – Рэжым доступу: http://www.upn.gov.sk/data/pdf/18-apr-1939.pdf. – Дата доступу: 14.02.2021.

**К содержанию**

УДК 32.019.5

**Д. А. КОРУНЕЦ**
Брест, БрГУ имени А. С. Пушкина
Научный руководитель – Е. И. Пашкович, канд. ист. наук, доцент

# МЮЗИК-ХОЛЛЫ – ПРОПАГАНДА БЕЗ ДЕКРЕТА

В статье рассматриваются мюзик-холлы в качестве инструментов пропаганды в британском обществе периода Первой мировой войны. В исследовании проведен анализ психологических и социальных причин популярности мюзик-холлов, психологические особенности использования музыки в качестве инструмента пропаганды, а также основные пропагандистские мотивы, используемые в музыке того периода.

С началом Первой мировой войны многие области британской культуры были мобилизованы правительством для поддержки боевых действий. В ход шли плакаты, карикатуры, газеты и др. С другой стороны, само британское общество испытывало патриотический подъем, что приводило порой к тем формам и методам пропаганды, которые использовались спонтанно самим населением и фактически не координировались со стороны правительства. Одной из таких форм пропаганды стала музыка. Тем не менее этот инструмент был достаточно нестабилен и противоречив, завися не столько от мнения правительства, сколько от настроения публики.

Прежде чем говорить о том, как музыка повлияла на настроение британского общества того периода, следует рассмотреть такое понятие, как «мюзик-холл». У данного термина существует несколько значений. Для начала, мюзик-холлами называли специальные заведения, в которых проводились музыкальные, актерские и иные выступления. В какой-то степени мюзик-холлы походят на другой тип развлекательных заведений – кабаре, однако основное отличие мюзик-холла в том, что в нем основным является именно музыка. Также мюзик-холлом называют и саму программу выступления в одноименных заведениях [2]. Популярность таких заведений в основном приходится на вторую половину XIX – 60-е гг. XX в. Особенностью мюзик-холлов в этот период является тот факт, что они являются скорее пролетарскими заведениями, куда практически не заглядывали представители высших слоев общества [1, с. 4].

В первые дни войны большинство мюзик-холлов начали менять свою программу на более патриотическую. Причины этого уже были указаны ранее: существовавший в тот период подъем гражданского сознания, а также основная целевая аудитория мюзик-холлов – рабочий класс. В этих условиях сформировалась новая повестка, которую владельцы заведений начали использовать не только из-за охватившего их энтузиазма, но и для извлечения личной выгоды. Сразу следует отметить, что данная повестка оказалась не только чрезвычайно популярной, но и чрезвычайно эффективной. Причина этого успеха была проста: звезды мюзик-холла были обожаемы массами людей из рабочего класса, и их слова имели совершенно иной эффект, чем у политических лидеров, в основном произведенных узкой прослойкой социальной элиты. Большая часть звезд мюзик-холла происходила из бедных семей и говорила с акцентом рабочего класса; они могли общаться с простыми людьми гораздо убедительнее, чем министры, генералы или епископы [1, с. 3–4].

Помимо этого, сама суть подобных заведений имела свою уникальную особенность, а именно атмосферу. Эти заведения были предназначены для релаксации, а также для развлечений в кругу друзей и приятелей. Это делает восприятие новостей несколько отличающимся от услышанного по радио на работе либо от лицезрения плаката на улице. Таким новостям начинаешь доверять больше, что связано с психологическим расслаблением человека в подобных местах. Поэтому пропагандистский аспект при такой подаче не отторгается, а, напротив, принимается.

Еще более мощным психологическим эффектом обладает музыка. Сама по себе она состоит из двух компонентов – мелодии, либо же «минуса», и текста, написанного в особой форме. Взаимодействие этих компонентов оказывает положительное либо отрицательное влияние на эмоциональную сферу человека. Соответственно, если влияние на эмоции положительное, то текст и заложенный в нем смысл воспринимаются положительно, даже если изначально эти идеи могли вызывать отрицательную реакцию у человека. Все эти аспекты делали музыку практически идеальным инструментом пропаганды, если бы не один недостаток: чтобы вышеназванное влияние произошло, музыка должна быть хорошей и в некоторой степени искренней – записанной и передающей эмоции автора, что практически невозможно воплотить без собственного вовлечения составителя песни.

Реакция промышленности на начало войны была незамедлительной. Номера мюзик-холла любили быть в курсе событий, и первые военные песни появились в течение нескольких часов. В специальной прессе авторы песен объявили, что они добавят «военный стих» к любой данной песне за небольшую плату. Сотни авторов песен и тысячи певцов

принялись за работу, чтобы заработать деньги на новой теме, внося свой вклад в патриотическое дело, в которое они верили [1, с. 4].

Взглянем сначала на те песни, которые направлены на то, чтобы побудить мужчин присоединиться или оправдать военные усилия в традиционной патриотической манере, здесь мы находим такие названия, как *«Трижды ура красным, белым и синим», «будь солдатом, мальчик мой»*, «*ты не хочешь вступить в армию?*», «*Мы не хотим потерять тебя (но мы думаем, ты должен идти)», «Марш на Берлин!».* Это только некоторые примеры подобных песен, на самом деле их было на порядок больше [1, с. 4–5]. Пропагандистский аспект этих песен заключался в основном в том, что они путем влияния на эмоциональную сферу молодых людей внушали им необходимость вступления в ряды вооруженных сил.

Тем не менее, хотя песни, прославляющие и поддерживающие солдат, будут выпускаться на протяжении всей войны, песни о вербовке быстро и почти полностью исчезают после декабря 1914 г. Все вышеперечисленные песни, кроме одной *(«Будь солдатом, мой мальчик»),* относятся к 1914 г. На период введения воинской повинности в Британии в 1916 г. подобные песни уже не будут так часто на слуху. Причины этого понятны. Первоначальная идея быстрой и легкой победы исчезла после огромных потерь, понесенных в самом начале войны, а также еще большего количества раненых и покалеченных, вернувшихся в Британию. В таких условиях произошло некое переформатирование общества. Оно все так же желало победы, но энтузиазм начала войны исчез. Поэтому мюзик-холлам также было необходимо измениться, чтобы оставаться актуальными и популярными.

В ряде песен использовалась в качестве пропагандистского инструмента женская соблазнительность. Подобный мотив присутствует в популярном хите 1915 г. певицы кокни Мари Ллойд *«Мне нравится она. Эй, Коки, теперь на тебе Хаки»,* в котором рассказывается история молодого рабочего, которого любимая девушка не воспринимала всерьез, но, как только он вступил в армию, он обнаружил, что она хочет сразу же стать его женой [1, с. 5]. Подобные песни воспроизводились до самого конца войны и подбадривали солдат и уходящих на фронт тем, что их старания будут оценены противоположным полом по достоинству.

Несмотря на патриотический подъем и желание сражаться, Британия не была едина. В ее национальных областях имело место определенное напряжение, которое подрывало национальный дух. Для нейтрализации этого напряжения использовались различные методы и инструменты, например плакаты. Музыка также подходила для этой цели ввиду указанных выше особенностей. Она использовалась для того, чтобы сплотить людей, показать то, что, несмотря на различия, они являются

Интерес представляет Воззвание Германского колониального общества 1884 г. В нем суммированы многие предыдущие тезисы – об эмигрантах, потерянных для родины; об экономической зависимости от других колониальных держав: «Германия импортирует продукцию тропических зон через иностранные поселения, тем самым ежегодно тратятся многие миллионы германского капитала, которые идут на пользу чужим нациям»; о потребности в рынке сбыта. Заканчивалось Воззвание требованием «практического и энергичного действия» [2, с. 290].

Популярность таких организаций быстро росла. Так, Германский колониальный союз, начав с 200 человек при основании, к 1884 г. насчитывал до 9 тыс. человек. В руководство организаций входили крупные промышленники, политики и аристократы. Это обеспечило этим обществам возможность лоббировать свои интересы перед правительством.

Сила сторонников колониальной экспансии к середине 1880-х гг. стала очевидна. О. фон Бисмарк, всегда заявлявший о том, что он противник колониальной гонки, в 1884 г. в течение трех недель удовлетворил просьбу купца А. Людерица о защите его собственности – земель вокруг бухты Ангра-Пекена. Уже 26 июня в рейхстаге он заявил:

«Империя должна предоставлять защиту и поддержку тем своим подданным, которые, проявляя мужество, энергию и воодушевление, приобретают заморские территории» [5, с. 351].

В числе факторов, повлиявших на решение «железного канцлера», называют также усилившиеся противоречия между другими державами: соперничество Франции и Великобритании в Египте, а также противостояние России и Великобритании в Средней Азии, что позволило Германии совершить акт активности, не боясь противодействия.

Таким образом, ряд внутренних и внешних факторов позволил Германии в короткий срок совершить колониальный рывок. Среди этих факторов можно выделить: активную внутреннюю пропаганду колониальных идей, заинтересованность крупного капитала в колониальных приобретениях, а также подходящую внешнеполитическую ситуацию.

Список использованной литературы

1. История Германии : учеб. пособие : в 3 т. / под общ. ред. Б. Бонвеча. – М., 2008. – Т. 2 : От создания Германской империи до начала XXI века. – 672 с.

2. История Германии : учеб. пособие : в 3 т. / под общ. ред. Б. Бонвеча. – М., 2008. – Т. 3 : Документы и материалы. – 592 с.

3. История дипломатии. Т. II / авт. тома В. М. Хвостов ; под ред. Г. Вербицкого. – М., 1963. – 820 с.

4. Ряполов, В. В. «Колониальный вопрос» в Германии (1870-е – 1880-е годы): в поисках национально-государственной идентичности [Электронный ресурс] / В. В. Ряполов // Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article. – Дата доступа: 25.03.2021.

5. Чубинский, В. В. Бисмарк: Политическая биография / В. В. Чубинский. – М., 1988. – 416 с.

6. Шмидт, В. О проблеме переселения в немецкие колонии по материалам колониальных журналов и публицистике Германии [Электронный ресурс] / В. Шмидт. – Режим доступа: https://articlekz.com/article/18251. – Дата доступа: 25.03.2021.

7. Friedrich Fabri, Bedarf Deutschland der Kolonien? [Elektronische Ressource]. – Zugriffsmodus: https://geschichtsbuch.hamburg.de/wp-content/uploads/sites/255/2016/05/Quelle-Bedarf-Deutschland-der-Kolonien.pdf. – Datum des Zugangs: 25.03.2021.

**К содержанию**

# ОБРАЗОВАНИЕ И ВОСПИТАНИЕ: ИСТОРИЯ И СОВРЕМЕННОСТЬ

УДК 94(476)

**С. А. ЖУК**
Брэст, БрДУ імя А. С. Пушкіна
Навуковы кіраўнік – І. І. Шаўчук, д-р гіст. навук, дацэнт

## АДНАЎЛЕННЕ АСПІРАНТУРЫ АН БССР У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1940-Х ГГ.

У артыкуле разгледжаны асноўныя заканамернасці аднаўлення аспірантуры ў АН БССР у другой палове 1940-х гг., паказаны ўмовы аднаўлення навучання аспірантаў у Акадэміі, выяўлена значэнне дзяржаўнай палітыкі ў эвалюцыі формаў і напрамкаў падрыхтоўкі.

Неабходнасць аднаўлення і развіцця навуковага патэнцыялу АН БССР у другой палове 1940-х гг. дэтэрмінавала патрэбу ўмацавання кадравага патэнцыялу, што, у сваю чаргу, стала трыгерам развіцця інстытуцыянальных форм падрыхтоўкі навукоўцаў: была адноўлена кандыдацкая аспірантура, створана сістэма экстэрнату. Акадэмія накіроўвала аспірантаў у доўгатэрміновыя камандзіроўкі ў навукова-даследчыя ўстановы АН СССР. Важнасць гэтай працы неаднойчы падкрэслівалася ў рашэннях дырэктыўных інстытутаў кіравання БССР, а таксама на ўзроўні органаў кіравання Акадэміяй.

Арганізацыя навучання ў аспірантуры АН БССР вялася ў адпаведнасці з Палажэннем "Аб аспірантуры" (1939), Палажэннем "Аб аспірантуры АН Беларускай ССР" (1939 г., зменена і дапрацавана ў 1950 г.) [1, арк. 16]. Штогод у Акадэміі арганізоўвалася прыёмная камісія, якую ўзначальваў адзін з віцэ-прэзідэнтаў (у другой палове 1940-х гг. гэта быў В. А. Лявонаў, які ў рабочым парадку курыраваў усю падрыхтоўку навукоўцаў ва ўстанове). Для прыёму ўступных іспытаў ствараліся прадметныя камісіі, у якія ўваходзілі дырэктары даследчых устаноў альбо іх намеснікі па навуковай рабоце, дактары альбо кандыдаты навук, а таксама навуковыя кіраўнікі [2, арк. 29–30]. Выключэннем з'яўлялася камісія па замежнай мове, што звычайна складалася з загадчыкаў профільных кафедр Мінскага педінстытута, а з 1949 г. – педінстытута замежных моў.

Штогод назіралася тэндэнцыя парушэння тэрмінаў залічэння (1 ліпеня – 15 верасня) [3, с. 174]. Асабліва яскрава гэта праявілася падчас першай пасляваеннай кампаніі, якая завяршылася толькі ў жніўні 1946 г.

у сувязі з пачаткам новага прыёму. Загады па Акадэміі сведчаць, што не менш за 50 % аспірантаў былі залічаны ў другой палове лістапада – першай палове снежня. Мелі месца выпадкі залічэння даследчыкаў у студзені наступнага года.

Гэта сітуацыя з'явілася лагічным наступствам цяжкасцяў з падборам кандыдатаў у аспірантуру, чаму спрыялі наступныя негатыўныя фактары: складанасці з падборам кандыдатаў, якія мелі вопыт практычнай работы, абмежаваныя магчымасці залічэння выпускнікоў ВНУ [4, арк. 92], слабае інфармаванне праз СМІ. Разам з тым да 1948 г. у АН БССР не было ніякіх памяшканняў для аспіранцкага інтэрната, у сувязі з чым “абітурыенты”, што не мелі жылля ў Мінску, нават не дапускаліся да ўступных іспытаў. Толькі ў 1949 г. на трэцім паверсе галоўнага корпуса Акадэміі частка пакояў была абсталявана пад названыя патрэбы, аднак у сувязі з павелічэннем колькасці акадэмічнай аспірантуры пытанне было вырашана толькі часткова. Не менш за 60–80 аспірантам у пачатку 1950-х гг. не хапала пакояў у інтэрнаце.

5 мая 1948 г. Прэзідыум прыняў рашэнне аб адкрыцці завочнай аспірантуры, а таксама “зацвердзіў план прыёму ў 50 чалавек”. Ён на працягу года неаднойчы пераглядаўся і ў выніку быў зменшаны да 25 чалавек. Першая прыёмная кампанія 1948/1949 гг. праведзена нездавальняюча, і да сакавіка 1949 г. у завочную аспірантуру залічана толькі 14 чалавек, хаця планам прадугледжвалася 25 [5, арк. 9]. Адкрыццё завочнай аспірантуры дазволіла прыцягнуць у аспірантуру настаўнікаў школ, ІТР, дзяржаўных служачых. Першапачатковыя планы арганізацыі завочнай аспірантуры сведчаць пра намеры кіраўніцтва Акадэміі пашырыць гэтую форму навучання даследчыкаў такім чынам, каб іх колькасць зраўнялася з аспірантамі дзённай формы. Найбольшае распаўсюджванне завочная аспірантура атрымала ў інстытутах Аддзялення грамадскіх навук, а таксама ва ўстановах, якія практычна не мелі сваёй матэрыяльна-тэхнічнай і вопытна-вытворчай базы.

Аднак завочная аспірантура ўжо ў канцы 1940-х гг. не апраўдала спадзяванняў кіраўніцтва Акадэміі. Матэрыялы рэспубліканскай праверкі 1951 г. сведчаць, што сістэма работы з аспірантамі-завочнікамі фактычна не была сфарміравана. Штогод 5–7 завочнікаў адлічваліся за “страту сувязі з навуковым кіраўніком”. Кіраўніцтва навуковых устаноў не ведала, чым займаюцца аспіранты. Той жа праверкай, напрыклад, выяўлены факты прызначэння аспірантам 1949 г. набору навуковых кіраўнікоў толькі ў 1951 г. (Інстытуты торфу, хіміі, меліярацыі, воднай і балотнай гаспадаркі), а ў Інстытуце літаратуры, мовы і мастацтва мелі месца выпадкі зацвярджэння тэмы дысертацыі толькі на трэцім годзе навучання [6, арк. 8б, 10, 27–31].

Падрыхтоўка навукоўцаў праз кандыдацкую аспірантуру ажыццяўлялася ўсімі даследчымі ўстановамі Акадэміі, за выключэннем

Літаратурнага музея імя Янкі Купалы і Сектара жалезачыгуннага ліцця і жалезачыгунных канструкцый, які існаваў у 1945 г., а потым быў уключаны ў склад Фізіка-тэхнічнага сектара. Дынаміка агульнай колькасці аспірантаў па ўстановах прадстаўлена ў табліцы.

Табліца – Дынаміка агульнай колькасці аспірантаў у АН БССР у 1945–1949 гг.

| **Навукова-даследчая ўстанова** | **Год** | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1945 | Жнівень 1946 | 1946 | 1947 | 1948 | 1949 |
| **Аддзяленне грамадскіх навук** | | | | | | |
| Інстытут гісторыі | 10 | 12 | 14 | 11 | 7 | 10 |
| Інстытут літаратуры, мовы і мастацтва | 10 | 7 | 7 | 9 | 9 | 8 |
| Інстытут эканомікі | 2 | 2 | 2 | 6 | 6 | 8 |
| Інстытут філасофіі і права | – | – | 3 | 4 | 4 | 11 |
| **Усяго па аддзяленню** | **22** | **21** | **26** | **30** | **26** | **37** |
| **Аддзяленне біялагічных, сельскагаспадарчых і медыцынскіх навук** | | | | | | |
| Інстытут сацыялістычнай сельскай гаспадаркі | 4 | 11 | 15 | 12 | 13 | 14 |
| Інстытут геалагічных навук | 2 | 2 | 3 | – | – | – |
| Інстытут тэарэтычнай медыцыны | 3 | 3 | 4 | 4 | 5 | 5 |
| Батанічны сад | 1 | 4 | 4 | 4 | - | - |
| Інстытут біялогіі | – | – | – | – | 3 | 7 |
| Інстытут меліярацыі, воднай і балотнай гаспадаркі | – | – | – | – | 6 | 7 |
| Інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі | – | – | – | – | – | 8 |
| **Усяго па аддзяленню** | **10** | **20** | **26** | **20** | **27** | **41** |
| **Аддзяленне фізіка-матэматычных і тэхнічных навук** | | | | | | |
| Інстытут торфу | 3 | 3 | 1 | 3 | 4 | 4 |
| Інстытут геалагічных навук | – | – | – | 4 | 2 | 5 |
| Інстытут хіміі | 5 | 7 | 8 | 7 | 8 | 10 |
| Фізіка-тэхнічны інстытут | 1 | 2 | 2 | 3 | 3 | 8 |
| Інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі | – | – | – | 5 | 7 | – |
| Архітэктурны сектар | – | – | – | – | – | 2 |
| Энергасектар | – | – | – | – | – | 3 |
| **Усяго па аддзяленню** | **9** | **12** | **11** | **22** | **24** | **32** |
| **Усяго па Акадэміі** | **41** | **53** | **63** | **72** | **77** | **110** |

*Заўвагі.* 1. Усе даныя, за выключэннем жніўня 1946 г., прадстаўлены на аснове гадавых справаздач Акадэміі.

2. Даныя за 1950 г. не выяўлены.

3. Назвы ўстаноў і аддзяленняў прыведзены па стане на снежань 1950 г.

4. Агульная колькасць аспірантаў па Акадэміі поўнасцю не суадносіцца з данымі М. І. Галенчыка ў сувязі з тым, што апошні арыентаваўся на матэрыялы ЦСУ.

Аднаўленне і рост аспірантуры адбываліся наступнымі шляхамі: пашырэннем падрыхтоўкі навукоўцаў у даследчых установах (Інстытуты біялогіі, хіміі, Фізіка-тэхнічны інстытут) за кошт павелічэння набораў і адкрыцця новых спецыяльнасцяў, а таксама за кошт адкрыцця аспірантуры ў новых установах АН БССР. У 1947 г. на базе Батанічнага саду і Інстытута сацыялістычнай сельскай гаспадаркі арганізаваны Інстытут біялогіі, а таксама створаны (адноўлены) Інстытут філасофіі і права, а Фізіка-тэхнічны сектар рэарганізаваны ў інстытут. У 1948 г. са складу названай установы выведзены Энергасектар. У 1949 г. тым жа шляхам на базе аддзела жывёлагадоўлі Інстытута сацыялістычнай сельскай гаспадаркі і Сектара лесу Інстытута біялогіі створаны Інстытуты жывёлагадоўлі і лесу, якія ўжо ў 1950 г. пачнуць падрыхтоўку навуковых кадраў. У 1947 г. пасля некалькіх няўдалых спроб Беларуская навукова-даследчая станцыя механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі перададзена Акадэміі і рэарганізавана ў Інстытут механізацыі сельскай гаспаркі. У 1948 г. на базе Водагаспадарчага сектара і перададзенага Акадэміі Беларускага НДІ меліярацыі і балотнай гаспадаркі створаны Інстытут меліярацыі, воднай і балотнай гаспадаркі. Трэба падкрэсліць, што ў Беларускім НДІ меліярацыі і балотнай гаспадаркі яшчэ ў 1945 г. была створана аспірантура і ўсе навучэнцы ў 1948 г. пераведзены ў АН БССР. Аднак большасць з іх (10 з 15) праходзілі падрыхтоўку ў аспірантуры Акадэміі толькі да лістапада – снежня 1948 г. і былі адлічаны ў сувязі з заканчэннем тэрміну навучання.

Аднаўленне і спробы фарсіраванага развіцця аспірантуры ў другой палове 1940-х гг. у АН БССР з’яўляліся неабходнымі мерапрыемствамі для актывізацыі падрыхтоўкі навуковых кадраў. У 1945 г. адноўлена кандыдацкая аспірантура, у 1945–1947 гг. рабіліся захады па арганізацыі дактаранцкай аспірантуры, якія канчаткова скончыліся няўдачай пасля канцэнтрацыі акадэмічнай дактарантуры ў АН СССР.

Колькасны рост аспірантуры ў другой палове 1940-х гг. адбываўся, перш за ўсё, за кошт першага пасляваеннага набору і адкрыцця завочнай аспірантуры. Трансфармацыя накірункаў падрыхтоўкі ў названы перыяд звязана з надзвычай хуткім аднаўленнем аспірантуры па грамадскіх навуках у 1945–1946 гг. У канцы 1940-х гг. імпульс надаецца аспірантуры інстытутаў сельскагаспадарчага і тэхнічнага профілю, што звязана з неабходнасцю актывізацыі рэканструкцыі сельскагаспадарчага комплексу БССР, а таксама з буйнымі праектамі рэспубліканскага і саюзнага ўзроўню, напрыклад комплекснага асваення Палесся. У сувязі з недастатковым забеспячэннем кадрамі, вытворчымі плошчамі і лабараторным абсталяваннем навучанне ў галіне прыродазнаўчых і дакладных навук не атрымала належнага развіцця.

Спіс выкарыстанай літаратуры
1. Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі (ЦНА НАНБ). – Ф. 1г. Спр. 67. Арк. 56.
2. ЦНА НАНБ. – Ф. 1. Спр. 553. Арк. 196.
3. Высшая школа: Основные постановления, приказы и инструкции / сост. М. И. Мовшович. – М. : Совет. наука, 1948. – 616 с.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Воп. 61. Спр 387. Арк. 263.
5. ЦНА НАНБ. – Ф. 1г. Спр. 39. Арк. 42.
6. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 73. Спр 5. Арк. 266.

**К содержанию**

УДК [394:908](476.7)

**А. А. ІГНАЦЮК**
Брэст, БрДУ імя А. С. Пушкіна
Навуковы кіраўнік – В. Ю. Піліповіч, ст. выкладчык

## ШКОЛА І АДУКАЦЫЯ Ў ШТОДЗЁННЫМ ЖЫЦЦІ СЯЛЯН КОБРЫНШЧЫНЫ Ў 30-Я – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ 40-Х ГГ. ХХ СТ. (НА ПРЫКЛАДЗЕ В. БАЛОТЫ)

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці адукацыі сялянскіх дзяцей Кобрыншчыны ў кантэксце сельскай штодзённасці 1930-х – першай паловы 1940-х гг. на прыкладзе в. Балоты. Улічаны сацыяльна-палітычны фон адзначанага перыяду. Вызначаецца ўплыў вясковага паўсядзённага ладу жыцця на арганізацыю і якасць школьнага навучання.

Школа займае значнае месца ў жыцці людзей. Адукацыя дае магчымасць асэнсаваць многія незразумелыя да гэтага рэчы. Аднак дадзены працэс у нашых продкаў амаль стагоддзе назад значна адрозніваўся ад сучаснасці. У 30-я гг. ХХ ст. школьная адукацыя толькі пачынае набываць масавы характар сярод сялянскага насельніцтва, і на яе развіццё ўплываў цэлы шэраг аб’ектыўных і суб’ектыўных фактараў. Мэтай даследавання з’яўляецца рэканструкцыя штодзённасці і асэнсаванне ўмоў, у якіх праходзіла школьнае навучанне і выхаванне дзяцей у адзначаны перыяд. Для гэтага патрэбна адказаць на шэраг даследчых пытанняў: якія абставіны ўплывалі на адукацыйны працэс; як выглядала школьная адукацыя; якім школьным прадметам надавалася большая ўвага; час і месца з’яўлення школ. Актуальнасць дадзенай тэмы заключаецца ў тым, што, асэнсоўваючы мінулае, мы маем магчымасць зрабіць правільныя

высновы з “урокаў гісторыі” і пазбегнуць шматлікіх памылак у будучыні. Неабходнасць неадкладнага вывучэння дыктуецца той акалічнасцю, што разам з людзьмі, якія сыходзяць з жыцця, знікае і “жывая” гістарычная памяць, так і не зафіксаваная да гэтага моманту.

Школьная адукацыя ў разглядаемым рэгіёне была абумоўлена палітычнай сітуацыяй, у якую трапіла тэрыторыя Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. [5, с. 352]. Па ініцыятыве польскіх уладаў тут былі адчынены шматлікія школы, дзе вывучаліся базавыя прадметы (пісанне, чытанне, арыфметыка).

Так, у в. Балоты Кобрынскага раёна было арганізавана некалькі школ. Размяшчаліся яны ў розных кутках сяла з-за шырокага рассялення яе жыхароў. На будаўніцтва вялікай школы не хапала сродкаў, таму размяшчаліся яны ў звычайных хатах, дзе былі прасторныя пакоі: *“Хата, зал такый і всё. Там гэтый гаспадар був з сым’ёю свэю. Кухня була отдельна і всё”* (Сцяпан Ігнацюк, 1928 года нараджэння, в. Балоты) [1]. Школы маглі значна адрозніваецца па памерах. Па-першае, гэта залежала ад мясцовасці, дзе знаходзілася хата. Па-другое – ад колькасці вучняў. Напрыклад, школа, што стаяла ў цэнтры вёскі, была большай за іншыя, што знаходзіліся ва ўрочышчах: *“Школа, шо ў цэнтры стоела, то цымалка була. Школьніков було мныго, а влазылы. А набыта була школа ого-го. Трыста чоловік ходыло”* (Якаў Ігнацюк, 1934 года нараджэння, в. Балоты) [2].

У той час у школу хадзілі дзеці featureрознага ўзросту: ад 6 да 9 гадоў і больш. Усталяваных нормаў на гэты конт не было. Маленькіх дзяцей, што жылі далёка на хутарах, бацькі баяліся адпраўляць саміх у школу, таму часта чакалі, пакуль яны падрастуць. Сустракаліся выпадкі, калі цяжкае сямейнае становішча не дазваляла дзецям ісці ў школу з шасці/сямі гадоў: *“Маты вмырла, а мыні шість літ було. Батько хозяйство звів, пока нам прывызлы там мачоху. Ну, то мусыть колы, у літ девять у школу пойшов”* (Сцяпан Ігнацюк, 1928 года нараджэння, в. Балоты) [1].

Вясковыя дзеці шмат працавалі дома, і ў многіх не было магчымасці наведваць школу кожны дзень. Сельскагаспадарчая праца перашкаджала дасканаламу навучанню школьнікаў. Часта дзяцей не пускалі ў школу праз дрэннае надвор’е, таму не раз прыходзілася прапускаць заняткі: *“Я у школу ны пошла, бо мороз був. А вона пытае: «А почему ты в школу не прішла?» Я кажу: «Бо ботінкы малыі, подэрты і мороз». А одын ученік як почув, то завжды дражныв: «Чы то тая, шо у школу ны пошла, бо ботінкы подэрты і мороз?»”* (Сафія Левая, 1926 года нараджэння, в. Балоты) [4].

Тэрмін навучання ў розных школах адрозніваўся. Ва ўрочышчы Езвынкы было толькі чатыры класы. У школе, што знаходзілася ў цэнтры

вёскі, навучаліся пяць гадоў. Але не ў кожнага атрымоўвалася скончыць усе чатыры або пяць класаў. Некаторых вучняў, якія вучыліся дрэнна, настаўнікі маглі пакінуць давучвацца па той жа праграме на другі год. З-за цяжкіх эканамічных умоў, у якіх знаходзілася сям'я, некаторыя дзеці маглі ўвогуле прапусціць цэлы навучальны год: *"Я в третій класс пэрыйшов, то і дня там ны був. Служыв я ж по людях. А маты вмырла"* (Сцяпан Ігнацюк, 1928 года нараджэння, в. Балоты) [1]. Шмат школьнікаў не змаглі атрымаць адукацыю праз вайну. Трэба адзначыць, што ў вёсцы некаторы час нават пры немцах працягвалі працаваць школы. Але потым гэтыя ўстановы ўсё роўна спальваліся партызанамі: *"Ну, мусыть, років тры я походыв і всё. Потом як началась партізанка в 1943 году, то зайшлы партізаны, сказалы на діректора школы: «Закрывай». І спалылы"* (Якаў Ігнацюк, 1934 года нараджэння, в. Балоты) [2].

У большасці выпадкаў у школах працавалі настаўнікі з Польшчы. Ад колькасці школьнікаў залежала і іх праца. Калі вучняў было няшмат, то хапала аднаго ці двух настаўнікаў. Так, ва ўрочышчы Езвынкы былі толькі два педагогі. У ходзе працы яны змянялі адзін аднаго: *"Первоначально там мужчына був. А як там яго... Забув. Барсунов чы як? А потом жэншчына була"* (Сцяпан Ігнацюк, 1928 года нараджэння, в. Балоты) [1]. Другім настаўнікам была жанчына, якая кожны дзень прыязджала з Кобрына: *"А шэ учітельніца Галіна звалася. Вона була Кобрыньска. Як день рожденіе було, то ужэ убралася хорошэ і кажа: «Моё день рожденія. Ідітэ наломітэ бэрэзыны». А там на Езвынках була бэрэзына. І наламалы і убралы тую хату. І вчітель прыйіхав. Вона так хорошэ вбрана. Помытаю, шо такое платье хорошэ. І яе поздравлелы, а вона нас командуе"* (Сафія Левая, 1926 года нараджэння, в. Балоты) [4].

Акрамя настаўнікаў, дзяцей навучаў святар. У польскія часы асобнае месца займала духоўнае выхаванне школьнікаў. Таму раз на тыдзень ў спецыяльна вызначаны дзень прыязджаў святар, каб "навучыць дзяцей малітвам": *"І батюшка прыезжав кажду сэроду, молітвы вчылы, «Отче Наш» і всё такое"* (Сцяпан Ігнацюк, 1928 года нараджэння, в. Балоты) [1]. Акрамя таго, падчас такіх заняткаў у пакоі абавязкова павінны былі быць крыж і абразы. У многіх выпадках святар мог сам прыносіць гэтыя рэчы, але не заўсёды гэта было зручна. Так, у школе, што знаходзілася ў цэнтры вёскі, у пакоі на сцяне вісеў вялікі драўляны крыж: *"А крыж, закрыплённый до стыны, і ны забырався, всё время був. І крыж був такый деревянный в тое жэ ж врэмя. І вылызный, на всю стыну, покрашэнный. В углу там ікона була коло крыжа. І становылыся на коліна молытыся. О то обязательно було"* (Якаў Ігнацюк, 1934 года нараджэння, в. Балоты) [2].

Галоўная мэта настаўнікаў заключалася ў тым, каб навучыць дзяцей пісаць і чытаць. Для гэтага былі неабходныя сродкі: сшыткі, атрамантка і

кнігі. Гэтыя рэчы не заўсёды маглі быць у школе. Таму часта прыходзілася бацькам школьнікаў купляць усё самім у горадзе: *"Но школа була платна. А як платна? За тое, шо учыть, то діректор заставлев тэбэ каждый тыждэнь йіздыты в Кобрынь за кныжкамы. Туды кныжкы, туды тое. Значыть, раз ты ученік і ты учышся в школе, то він мае право заставыты, шоб батько йіхав за кныжкамы у Кобрынь"* (Якаў Ігнацюк, 1934 года нараджэння, в. Балоты) [2]. Дзеці абавязкова вывучалі і арыфметыку. Для лепшага яе вывучэння ў школе ва ўрочышчы Езвынкы віселі спецыяльныя лічыльнікі: *"Шчоты о такыі во булы. І там ны то шо лінейка, як зара лінеечка, а кіёчок такый, которым так во гоняешь, як до тых шчотов зайдэш"* (Сцяпан Ігнацюк, 1928 года нараджэння, в. Балоты) [1].

З-за таго, што школы дзейнічалі ў "польскія часы", то мова, якую вывучалі ў школах, была польская. На гэтай жа мове ў асноўным вяліся ўрокі. Аднак больш дасканала польскую мову вывучалі дзеці старэйшых класаў. У ваенны час дзеці пачыналі вывучаць і нямецкую мову: *"Польскый там преподовалы більшым оно классам. А мэньшым по-маленьку подходылы. Русского ны було і белорусского ны було. Немецкый уже усовалы. О то ж пры немцах гэта штука була. Немецкый язык надо було зучаты обязательно"* (Якаў Ігнацюк, 1934 года нараджэння, в. Балоты) [2]. У школьнікаў абавязкова выхоўвалі пачуццё працалюбства. Таму на ўроках працоўнага навучання кожны з вучняў выконваў нейкую працу: *"Ну, колысь дывчета вышывалы, а хлопчыкы робылы корзінкы"* (Сафія Левая, 1926 года нараджэння, в. Балоты) [4].

За дрэнныя паводзіны школьнікаў каралі. Настаўнікі нават мелі права біць вучняў. Віды кар былі самыя розныя: біццё па руках, стаянне на каленях або ў вуглу і інш. Так, у школе ва ўрочышчы Езвынкы святар заставіў вучня стаяць на каленях і трымаць палена на руках за тое, што той разбіў лямпу, якая вісела на стале: *"Батюшка прыезжев. Лампу я побыв. Я по гэтых скамейках біг на пэрырыв і зачыпыв лямпу, і шкло побылось. І за кару то раз трымав якоесь поліно на колінёх"* (Сцяпан Ігнацюк, 1928 года нараджэння, в. Балоты) [1]. Самае распаўсюджанае пакаранне – біццё па руках лінейкай. Пасля гэтага вельмі часта у дзяцей апухалі рукі: *"Но былы ны шкодуючы. Возьмэ пальцы, выжмэ, возьмэ линейку, влупыть. То некоторы раз спэрхнэ. Ну, то яго і боелысь"* (Аляксей Левый, 1931 года нараджэння, в. Балоты) [3]. Часта дзяцей ставілі на калені. Пры гэтым настаўнікі маглі насыпаць гарох ці грэчку, куды і станавіліся школьнікі: *"На грэчку ставылы коліньмы. Ты в наговыцях, то трэбо закотыты. Грэчку насыплють, гороху. І скажуть, шоб ты мінут 20 ілі 30 стоев на колінях. Аж повлазять у шкуру грэчка чы горох"* (Якаў Ігнацюк, 1934 года нараджэння, в. Балоты) [2].

Такім чынам, у ходзе даследавання была разгледжана школьная штодзённасць у вёсцы Балоты на прыкладзе дзвюх школ, якія існавалі ў вызначаны перыяд: школы ў цэнтры вёскі і ва ўрочышчы Езвынкы. Супаставіўшы іх, можна зрабіць выснову, што ў першай і другой навучальных установах сістэма адукацыі амаль не адрознівалася. Гэта дае магчымасць у некаторай ступені распаўсюдзіць вынікі вывучэння і на іншыя сельскія грамады Кобрыншчыны. Адметнасцямі адукацыі, што адбіліся ў далейшым на жыцці людзей, можна назваць заняткі са святаром з мэтай духоўнага выхавання дзяцей, строгасць настаўнікаў, што садзейнічала прывучэнню да парадку з маленства, і навучанне на польскай/нямецкай мовах. Акрамя таго, вызначаны некаторыя праблемы школьнай адукацыі гэтага часу: недахоп патрэбных сродкаў для лепшага навучання, адсутнасць магчымасці пастаянна наведваць школу, пачатак вайны. Неабходна ўлічваць вызначальны факт: працэс навучання школьнікаў праходзіў пад палітычным і культурным панаваннем польскай улады, працягам да надыходу ваеннага часу. У выніку праз увядзенне ў навуковы ўжытак новых вуснагістарычных крыніц, занатаваўшых гістарычную памяць, адбылася спроба рэканструкцыі асноўных момантаў школьнай адукацыі ў кантэксце сялянскай штодзённасці ў 30-я – першай палове 40-х гг. ХХ ст.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Ігнацюк С. І., 1928 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Балоты, 2021.

2. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Ігнацюк Я. І., 1934 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Балоты, 2021.

3. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Левый А. В., 1931 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Балоты, 2021.

4. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Левая С. А., 1926 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Балоты, 2021.

5. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.] ; рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2006. – 613 с.

**К содержанию**

УДК 94(476)

**Д. А. САМАНДЫК**
Брэст, БрДУ імя А. С. Пушкіна
Навуковы кіраўнік – А. Ю. Бодак, канд. гіст. навук, дацэнт

# УПЛЫЎ САВЕЦКАГА КІНЕМАТОГРАФА НА ВЫХАВАННЕ ВУЧНЯЎ У САВЕЦКІХ ШКОЛАХ У 1930–1953 ГГ.

Гэты артыкул уяўляе сабой незалежнае даследаванне актуальных тэм. Аўтар аналізуе ўплыў дзяржаўнай палітыкі ў галіне адукацыі на фарміраванне асобасных якасцяў савецкага школьніка ў перыяд 1930–1953 гг.

З узнікненнем і далейшым развіццём кінематографа жыццё чалавека істотна змянілася. З дапамогай гэтага віду творчасці чалавек атрымаў магчымасць не толькі прадстаўляць у сваіх думках дзеянні герояў прачытаных кніг, але і пабачыць гэта, адчуць праз створаны рэжысёрам візуальны вобраз. Пасля з’яўлення кіно, якое было знята не па бестселерам, а па асобным сцэнарыям, чалавек зразумеў сілу гэтага элемента творчага жыцця.

Так, любы фільм, як і любы мастацкі твор, можа ўплываць на свядомасць чалавека.

Увага да твораў кінематографа, якія распавядаюць пра жыццё школьнікаў, асабліва да іх ідэалагічнай часткі, у 1930–1953 гг. пастаянна ўзмацнялася. Барацьба з захапленнем камерцыйнымі фільмамі, неарганізаванымі і стыхійнымі наведваннямі кінатэатраў дзецьмі і падлеткамі, пачатак якой быў пакладзены ў 1920-х гг., была працягнута. Барацьба гэтая бачылася, напрыклад, у павелічэнні колькасці фільмаў адпаведнага зместу (пра гераізм юных рэвалюцыянераў, пра савецкую школу, піянерскія арганізацыі, удзел вучняў у калектыўных справах, масавыя мерапрыемствы і рухі і г. д.). Усе фільмы, якія ствараліся для дзяцей, павінны былі быць ідэалагічна вытрыманымі і адказваць асноватворнаму метаду сацыялістычнага рэалізму [4].

У 1936 г. кінастудыя “Межрабпомфильм” былаператворана ў кінастудыю “Союздетфильм” (з 1948 г. яна стала называцца кінастудыяй імя М. Горкага), якая стала непасрэдна спецыялізавацца на фільмах для школьнікаў і моладзі. Усяго з 1936 па 1948 г. на “Союздетфильме” было пастаўлена 77 фільмаў. І хоць усе яны ў першую чаргу прызначаліся для дзіцяча-юнацкай аўдыторыі, школьная тэма не была там асноўнай [4].

Дадзены від савецкага кінематографа не толькі ўплываў на стаўленне школьнікаў да вучобы, настаўнікаў, калектыву, але і спрыяў фарміраванню адпаведных стэрэатыпаў і ўстановак. Велізарны пласт твораў для дзяцей ствараўся шляхам спрашчэння, схематызацыі, абагульнення, якія ёсць

не што іншае, як асноўныя прыкметы стэрэатыпаў. Менавіта гэтыя добрыя, прафесійныя, але не прэтэндуючыя на статус шэдэўраў творы давалі ўзорныя прыклады падобнай з'явы. Іх можна вызначыць як стэрэатыпа-ўтваральніцкія [2].

Адной з важных дзяржаўных задач у 1930-я гг. і ў першыя пасляваенныя гады працягвала заставацца барацьба з дзіцячай бездагляднасцю. У 1930-я гг. гэтай праблеме быў прысвечаны шэраг фільмаў-экранізацый: “Пуцёўка ў жыццё” (1931), “Сямікласнікі” (1938), “Настаўнік” (1939) і інш. Усе гэтыя кінастужкі аперыравалі адным і тым жа наборам базавых элементаў, якія маюць дачыненне як да фабульнай іх часткі, так і да тых ідэалагічных і эстэтычных установак, на якіх трымаецца дадзеная жанравая канвенцыя [1].

Калі ў папярэдні перыяд развіцця кінематографа пра школу сюжэтная лінія замяшчэння сям'і дружным калектывам толькі пачынала развівацца, то ў 1930–1950-я гг. гэта ўжо стала практычна стандартам. Нівеліраванне ролі сям'і (выключэнне складалі толькі ідэалагічна падкаваныя сям'і, якія можна ўбачыць у фільмах “Абудзіце Леначку” (1934), “Прыяцелі” (1940), “Першакласніца” (1948), “Сямікласнікі” (1938), “Два сябра” і інш.) стала вызначальным. Ва ўсіх гэтых стужках рабіўся акцэнт на няўхільнае захаванне нормаў савецкай ідэалогіі і маралі, якія і вызначалі права школьніка быць членам калектыву (класа, каманды, звяна) [4].

Далучэнне да працы і масавых калектыўных спраў вылучалася як важны сродак выхавання юных грамадзян савецкай краіны. Сіла і моц калектыўнай грамадскай працы школьнікаў знайшла сваё ўвасабленне ў цэлым шэрагу фільмаў: “Сенька з «Мімозы»” (1932), “Адчайны батальён” (1933), “Цімур і яго каманда” (1940), “Сінягорыя” (1946), “Насустрач жыццю” (1952) і інш. [3].

У канцы 1930-х гг. у сувязі з напружаным геапалітычным становішчам і магчымай пагрозай перад паступова ўзніклай пагрозай пачатку вайны адной з актуальных дзяржаўных задач выступала ваенна-патрыятычнае выхаванне школьнікаў, адлюстраванае ў фільмах “Асабістая справа” (1939), “Брат героя” (1940) і інш. У пасляваенныя гады тэма патрыятызму і маральнага выхавання школьнікаў у камуністычным духу працягвала быць адной з цэнтральных у выхаваўчым кантэксце (“Чырвоны гальштук” (1948), “Гонар таварыша” (1953) і інш.) [1].

Уласна на школьную тэму ў кінастудыі “Союздетфильм” было знята ўсяго 9 фільмаў (11 %) з 77: “Сямікласнікі” (1938), “Асабістая справа” (1939), “Вясновы паток” (1940), “Брат героя” (1940), “Рамантыкі” (1941), “Сінягорыя” (1946), “Сельская настаўніца” (1947), “Чырвоны гальштук” (1948) і “Першакласніца” (1948) [4].

У савецкім кіно сталінскага перыяду адбылася трансфармацыя вобразаў школьнікаў. Калі ў кінатворах 1920-х гг. персанажы-школьнікі адстойвалі свае права на самастойнасць (напрыклад, каб стаць піянерамі), то ў 1930-я гг. школьнікі ўжо былі здольныя змагацца з ворагамі сацыялізму і працаваць на карысць Радзімы нароўні з дарослымі. Праца, вучоба і барацьба за светлую будучыню выступалі характэрнай рысай для фільмаў 1930–1950-х гг. [3].

Згодна з пастулатам сацыялістычнага рэалізму, настаўнік у фільмах школьнай тэматыкі дадзенага перыяду ўяўляў сабой узор для пераймання як у вонкавым абліччы, так і ў светапоглядным плане. Калі настаўнік з'яўляўся ў цэнтры ўвагі кінарэжысёраў у 1930–1940-я гг., то ён прыраўноўваўся ў сваёй сацыяльна-культурнай ролі да рэвалюцыянера, падзвіжніка, будаўніка новага грамадства.

Такім падзвіжнікам была, напрыклад, Варвара – галоўная гераіня з фільма "Сельская настаўніца" (1947), якая здзяйсняе самаадданыя і смелыя ўчынкі. Па абавязку прафесіі яна едзе ў глухое сяло настаўнічаць, адважна ўступае ў барацьбу з кулакамі і г. д. Яшчэ адзін характэрны прыклад адлюстравання настаўніка – персанаж з фільма "Пуцёўка ў жыццё" (1931), які ўжо не мае ніякага дачынення да дарэвалюцыйнай інтэлігенцыі і, па сутнасці, сам плоць ад плоці, так бы мовіць, аб'ект выхавання. Гэта падкрэслена ўсімі жэставымі характарыстыкамі героя, а таксама яго гатоўнасцю ўжыць гвалт. Адзіны выхаваўчы інструмент у яго руках не адукацыя, што, можа быць, і апраўдана ў адносінах да бездагляднікаў, а прымусовая, але радасная і стваральная праца [1].

Да другой паловы 1930-х гг. на савецкім экране цалкам сфарміраваўся суперстаноўчы вобраз настаўніка, педагога, які атрымаў безумоўнае прызнанне і павагу з боку дзяржавы (ордэны, ганаровыя граматы і іншыя ўзнагароды) і грамадства ў цэлым. Так, галоўнага героя фільма "Настаўнік" (1938) вылучаюць у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР, і гледачы чуюць надзвычай важную для ідэалагічнай канцэпцыі гэтай карціны фразу: "Настаўнік – гэта новы чалавек, і яго такім зрабіла савецкая ўлада!" Аналагічныя экранныя іміджы ўзорных і ўсімі паважаных настаўнікаў, педагогаў былі створаны ў фільмах "Сінягорыя" (1946), "Сельская настаўніца" (1947) і "Першакласніца" (1948) [3].

У цэлым у сталінскую эпоху канструяванне прафесійнага вобраза школьнага настаўніка ўяўляла сінкрэтызм вобразаў савецкага і рускага інтэлігентаў. Старарэжымны вобраз выконваў функцыю легітымацыі ў адносінах да савецкага на падставе агульнага рэвалюцыйнага мінулага. Асноўныя рысы дарэвалюцыйнага інтэлігенцкага міфа (месіянская ідэя, асвета, аскетызм, бескарыслівасць, самаахвяраванне) атрымалі новую

інтэрпрэтацыю ў сталінскай карціне свету. Названыя рысы з гэтага часу гублялі аўтаномію ад улады і ўбудоўваліся ў дзяржаўную ідэалогію [2].

Такім чынам, адным з элементаў савецкай ідэалогіі, які аказваў уплыў на вучняў у 1930–1950-я гг., быў кінематограф.

Уплыў кінематографа сталінскага перыяду на выхаванне школьнікаў быў вялікім у сувязі з тым, што ў ім атрымалі распаўсюджванне тэмы, якія дазвалялі як вырашыць узніклыя пасля рэвалюцыі праблемы, так і выхаваць годнага савецкага грамадзяніна. Сярод гэтых тэм вылучаюцца наступныя:

1. Барацьба з дзіцячай бездагляднасцю (“Пуцёўка ў жыццё” (1931), “Сямікласнікі” (1938), “Настаўнік” (1939) і г. д.).

2. Тэма дамінавання калектыўнага, а не індывідуальнага пачатку (“Абудзіце Леначку” (1934), “Прыяцелі” (1940), “Першакласніца” (1948) і г. д.).

3. Далучэнне да працы і масавых калектыўных спраў (“Сенька з «Мімозы»” (1932), “Адчайны батальён” (1933), “Цімур і яго каманда” (1940)).

4. Ваенна-патрыятычнае выхаванне школьнікаў (“Асабістая справа” (1939), “Брат героя” (1940), “Чырвоны гальштук” (1948), “Гонар таварыша” (1953)).

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Романова, О. Эволюция «школьного фильма» в советском кино [Электронный ресурс] / О. Романова. – Режим доступа: https://urokiistorii.ru/article/1061/. – Дата доступа: 30.11.2020.

2. Федоров, А. Школа и вуз в зеркале советского кино 1920-х – начала 1950-х годов [Электронный ресурс] / А. Федоров, А. Левицкая, О. Горбаткова. – Режим доступа: https://www.kino-teatr.ru/kino/art/kino/4720/. – Дата доступа: 30.11.2020.

3. Челышева, И. В. Советские игровые фильмы эпохи сталинизма (1931–1953) на школьную тему [Электронный ресурс] / И. В. Челышева. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/sovetskie-igrovye-filmy-epohi-stalinizma-1931-1953-na-shkolnuyu-temu/. – Дата доступа: 30.11.2020.

4. Школа и вуз в зеркале советского и российского кинематографа [Электронный ресурс] / под ред. А. В. Федорова, А. А. Левицкой, О. И. Горбатковой. – Режим доступа: https://ifap.ru/library/book595.pdf/. – Дата доступа: 30.11.2020.

**К содержанию**

УДК 371.3

**Г. В. СВЕНТУХОВСКАЯ**
Минск, РИВШ
Научный руководитель – С. В. Панов, канд. пед. наук, доцент

## РАБОЧИЕ ЛИСТЫ КАК ФОРМА СТРУКТУРИЗАЦИИ УЧЕБНОГО ТЕКСТА В ПРОЦЕССЕ ИСТОРИКО-ОБЩЕСТВОВЕДЧЕСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ

В статье представлен теоретический и практический опыт организации работы с текстом учебных пособий. Показано, что это одно из эффективных условий структуризации учебного текста и организации процесса обучения. Объясняются особенности, требования к составлению структурированного рабочего листа, направленного на успешное овладение учащимися различными способами и приемами работы с информацией.

Вызовы современного мира приводят к тому, что учение и обучение должны быстро и без значимых потерь адаптироваться к разным формам взаимодействия учителя и учащихся: очное, дистанционное или онлайн; самостоятельное изучение темы или под руководством учителя. Этот процесс неразрывно связан с обработкой больших объемов информации, ее пониманием и последующей интерпретацией и преобразованием.

Для того чтобы учащиеся могли успешно интерпретировать и извлекать информацию, им необходимо овладеть рядом не только предметных, но и метапредметных умений. Эффективным средством, стимулирующим развитие мыслительной деятельности в процессе работы с информацией, является рабочий лист. Это система заданий по одной теме, предполагающих их последовательное выполнение в процессе знакомства, обработки и преобразования информации по теме урока. В отличие от вопросов и упражнений в рабочей тетради рабочий лист представляет собой своеобразную траекторию учебной деятельности на конкретном уроке.

Структура и содержание рабочих листов отличаются целями и задачами конкретного урока. Их объединяет развитие информационных и коммуникативных компетенций, а задачи могут быть следующими:

– нахождение и выделение в тексте фактов, ключевых слов и словосочетаний, позволяющих структурировать текст;

– формулирование выводов, собственных суждений, умозаключений;

– группировка фактов и явлений;

– умение строить высказывание в письменной форме;

– умение находить информацию, данную в скрытом, неявном виде, и преобразовывать ее;

– самостоятельное приобретение знаний.

При составлении рабочего листа необходимо соблюдать ряд условий. Во-первых, комплекс заданий в рабочем листе должен быть релевантным материалу урока, не ограничивать творческий потенциал учащихся. Количество заданий варьируется временными рамками, отведенными на выполнение. Например, рабочий лист может быть рассчитан на урок либо может заполняться на протяжении нескольких уроков, т. е. объединять несколько тем. Во-вторых, рабочий лист используется учителем как своеобразный план или структура урока, направленные на последовательное выполнение взаимосвязанных заданий. В-третьих, задания должны быть представлены разными уровнями учебной деятельности, чтобы реализовать свои возможности могли учащиеся с разной познавательной активностью (рисунок 1).

***<u>РАБОЧИЙ ЛИСТ ПО РАЗДЕЛУ «БССР В ГОДЫ ВТОРОЙ МИРОВОЙ И ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙН»</u>***

**1. НАЧАЛО ВТОРОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ. ВОССОЕДИНЕНИЕ ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ С БССР**

**ЗАДАНИЕ 1. СОСТАВЬТЕ ЛЕНТУ ВРЕМЕНИ «ЭТАПЫ ВОССОЕДИНЕНИЯ ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ С БССР»**

**ЗАДАНИЕ 2. ОЦЕНИТЕ ПАКТ МОЛОТОВА-РИББЕНТРОПА**

| | |
|---|---|
| **Плюсы** | |
| **Минусы** | |
| **Неоднозначно** | |

**ЗАДАНИЕ 3. Охарактеризуйте преобразования в западных областях БССР. Определите + и – стороны, объясните своё мнение**

| Преобразования | +/- | аргументирование |
|---|---|---|
| обучение на родном языке | | |
| депортирована /выслана/ часть населения | | |
| объединение белорусского народа | | |
| Репрессии | | |
| ликвидация безработицы | | |
| Коллективизация | | |
| увеличение объёма выпускаемой продукции | | |
| запрет деятельности партий | | |
| открытие промышленных предприятий | | |

Рисунок 1 – Фрагмент рабочего листа «Начало Второй мировой войны. Воссоединение Западной Беларуси с БССР», история Беларуси, 9 класс

В-четвертых, грамотно составленный рабочий лист может заполняться учащимися как под руководством учителя, так и самостоятельно. Задания соответствуют структуре изучаемого параграфа. В-пятых, рабочий

лист должен быть направлен на развитие не только предметных, но и метапредметных компетенций, отражать личностные и регулятивные умения учащихся (рисунок 2).

Где есть насилие — нет дружбы и любви?

1.Объясните понятие

Буллинг ________________________________________

________________________________________

2. Охарактеризуйте буллинг

| | Буллинг |
|---|---|
| Виды | |
| Признаки | |
| Последствия | |

Почему буллинг – это болезнь всей группы, а не отдельного человека?

________________________________________

________________________________________

3. Составьте памятку

| Что нельзя делать при буллинге | Что можно делать при буллинге |
|---|---|
| ➢ | ➢ |
| ➢ | ➢ |
| ➢ | ➢ |
| ➢ | ➢ |

4. Напишите пять правил общения для предотвращения буллинга в классе и школе:

1. ________________________________________
2. ________________________________________
3. ________________________________________
4. ________________________________________
5. ________________________________________

5. **Послесловие**

*я узнал(-а) / научился(-ась)* ________________________________________

*у меня появились вопросы* ________________________________________

*я поменял(-а) свое мнение* ________________________________________

*я не поменял (-а) свое мнение* ________________________________________

Рисунок 2 – Рабочий лист «Где есть насилие – нет дружбы и любви (“Межличностные отношения”)», обществоведение, 9 класс

К заданиям в рабочем листе можно представить ряд требований и пожеланий:

– задания не должны быть однотипными, а должны стимулировать к дальнейшему поиску ответов;

– необходимо использовать проблемные задания, предполагающие работу с информацией, ее критическое осмысление и самостоятельно сформулированные выводы;

– вопросы и задания должны способствовать формированию и развитию умений работы с информационным текстом и проектироваться с учетом не только учебного, но и воспитательного потенциала;

– обязательно наличие блока вопросов для рефлексии и самооценки.

Можно назвать несколько примеров заданий, которые интересны учащимся, способствуют их мыслительной деятельности, развивают навы-

ки работы с текстом, формируют информационные и коммуникативные компетенции:

1. «Квадрат Декарта», «Диаграмма Исикавы», «SWOT-анализ», «PEST-анализ», простые и сложные матрицы (или сравнительные таблицы) и другие таблицы 2x2.

Цель – используя теоретические данные, личностный опыт, проанализировать информацию, структурировать ее по заданным параметрам.

Планируемые результаты – установление причинно-следственных связей, развитие исследовательских навыков, умений отделять факты от оценочных суждений, формирование критического мышления.

2. Интеллект-карта и другие формы визуализации.

Цель – визуализация изучаемого материала, систематизация данных.

Планируемые результаты – осознанная обработка информации и запоминание, основанное на ассоциативном мышлении.

3. Анализ изображений, видео (используются QR-коды).

Цель – развитие критического мышления, использование изображений и видеоматериалов как источников работы, формирование навыков работы с ними.

Планируемые результаты – формирование и развитие информационной грамотности, умение переводить информацию из разных знаковых систем в текстовую форму.

Таким образом, рабочий лист – это фактически последовательность действий, заданий, предполагающих работу на уроке и дома. Они являются компетентностно ориентированными, направленными на достижение предметных, метапредметных и личностных результатов учебной деятельности учащихся для реализации личностных творческих и интеллектуальных потребностей.

Список использованной литературы

1. Царенкова, В. В. Логическая структуризация учебного материала как средство систематизации и обобщения знаний [Электронный ресурс] / В. В. Царенкова, С. И. Шпановская // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. – 2014. – № 5 (169). – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article. – Дата доступа: 30.12.2020.

2. Панченко, М. Н. Универсальный рабочий лист для работы с учебным текстом на уроках естественнонаучного цикла [Электронный ресурс] / М. Н. Панченко // Педагогика и современность. – 2016. – № 2. – Режим доступа: https://elibrary.ru/item.asp?id=26009439. – Дата доступа: 25.12.2020.

**К содержанию**